Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

СЬНЕЖАНЬ 18 1932 г. № 281 (4533) Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Адпор апартуністам і прымірэнцам. М. ВЯРНІКОЎСКІ— Палепшыць парткіраўніцтва камсамолам (2 стар.). ХАЦКЕВІЧ — Фінансавыя задачы 1933 году (3 стар.).
АБ ВЫНІКАХ СЬНЕЖАНЬСКАГА ПЛЕНУМУ ЦК КП(б)Б — 3 пастановы сходу партактыву г. Менску па дакладу т. Галадзеда.
З бальшавіцкай упартасьцю змагацца за перамогу на фронце збожжазагатовак (1 ст.).
Ільнамялкам — кругласутачную нагрузку (1 стар.).
Нахлебнікі ў калгасе зьніжаюць кошт працадня (2 стар.).
Паскорыць зварот таварнага вагона (2 стар.).
Прамарцелі Бабруйску і Рагачова марудна перабудоўваюцца (3 стар.).
Юбілей Якуба Коласа—НА БАЛЬШАВІЦКІ ТРОП (3 стар.).
Праграмная прамова Шлейхэра (4 стар.).
Шотан адмовіўся фармаваць габінэт (4 стар.).
Англа-пэрсыдзкі канфлікт (4 стар.).
Абвастрэньне італа-югаслаўскіх адносін (4 стар.).

Адпор апартуністам і прымірэнцам

Апублікаваныя намі ў апошнім нумары газэты пастановы бюро ЦК КП(б)Б, ухваленыя ў сувязі з нездавальняючым ходам загатовак асноўных відаў сельска-гаспадарчай прадукцыі, павінны прыцягнуць, і бязумоўна прыцягнуць узмоцненую ўвагу ўсіх партыйных арганізацый рэспублікі. Гэтыя пастановы прадстаўляюць сур'ёзны ўдар па апартуністах і прымірэнцах, якія зрываюць выкананьне важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній.

Посьпех загатоўчай работы ў гэтым годзе ў большай меры чым калі-б там ні было раней, цясьнейшым чынам зьвязан са станам і работай партыйнай арганізацыі. Посьпех барацьбы на загатоўчым фронце вырашаюць бальшавіцкая вытрыманасьць і стойкасьць, неаслабная пільнасьць да клясавага ворага і яго манэўраў, уменьне па-бальшавіцку арганізаваць масы для рашучага перамаганьня кулацкага супраціўленьня і сабатажу. Малейшае аслабленьне клясавай пільнасьці, малейшае патураньне кулаку і яго апартуністычнай агентуры ўзмацняе супраціўленьне клясавага ворага.

Стан загатовак у тым ці іншым раёне характарызуе і стан партыйнага кіраўніцтва. Ход загатоўчай работы можа служыць амаль беспамылковым мерылам для вызначэньня клясавай пільнасьці тэй ці іншай арганізацыі, ступені перабудовы ўсёй сваёй работы ў масах, не сапраўднай, — не на словах, а на справе, — ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі і непрымірымасьці да клясавага ворага, апартуністаў і прымірэнцаў.

Пастановы бюро ЦК і выходзяць з гэтых бясспрэчных палажэньняў.

Кіраўнікі найбольш адстаючых па загатоўках раёнаў—**Лоеўскага, Нараўлянскага, Чырвонапольскага, Чачэрскага, Пятрыкоўскага, Церахаўскага, Буда-Кашалеўскага, Горацкага, Талочынскага, Асьвейскага і Дубровенскага,**—як зьнятыя пастановай ЦК з работы з разглядам пытаньня аб іх партыйнасьці ў ЦКК, так і атрымаўшыя апошняе папярэджаньне, ня могуць прывесьці ў апраўданьне свайго адставаньня па загатоўках ніякіх аб'ектыўных прычын.

Вядома, што загатоўчыя пляны, у прыватнасьці і асабліва па збожжы, сёлета значна меншыя, чым летась. Рад раёнаў рэспублікі з посьпехам ужо скончылі загатоўкі, другія блізкія да скончаньня. Не адна сотня калгасаў і сельсаветаў з гонарам да тэрміну выканалі свае абавязацельствы перад дзяржавай. Гэта — вынік сапраўды бальшавіцкай барацьбы за плян, уменьня правільна кіраваць масамі, клясавай баяздольнасьці партыйнай арганізацыі, яе пільнасьці да кулака і ўсіх яго манэўраў і хітрыкаў.

Як-бы не прабавалі мясцовыя арганізацыі адстаючых раёнаў знайсьці якія-небудзь асаблівыя прычыны аб'ектыўнага характару, якія-б маглі апраўдаць іх адставаньне, — іх, гэтых аб'ектыўных прычын, няма. Варта толькі ўважліва прыглядзецца да становішча ў адстаючых раёнах і адразу выявіш грубейшыя праваапартуністычныя і «лявацкія» скажэньні лініі партыі, прычым гэтыя «лявацкія» скажэньні часамі носяць характар яўнай кулацкай праваканцыі.

Аб'ектыўных прычын адставаньня няма, а ёсьць прытупленьне клясавай пільнасьці, апартуністычная размагнічанасьць, дэмабілізаванасьць, бязьдзейнасьць, самацёк, а часамі і простае патураньне кулаку.

Хіба-ж ня простым патураньнем кулаку зьяўляецца тое, што кулак усялякі выкручваецца ад выкананьня цьвёрдых заданьняў? Хіба не патураньнем кулаку зьяўляецца ліберальная цярплівасьць да яго спроб сарваць выкананьне дзяржаўных загатовак?

Кулацтва разгромлена і яно ўжо ня ў стане весьці з намі адкрытай барацьбы. Але рэшткі кулацтва, угнезьдзіўшыся ў калгасах, а сям-там, дзякуючы ўдалай маскіроўцы, і ў нізавым савецкім апараце, вядуць з намі барацьбу **ў скрытых формах**. Улюбёным сродкам барацьбы зьяўляецца распальваньне дробна-ўласьніцкіх тэндэнцый сярод адсталай часткі калгасьнікаў, расьцягваньне і разбазарваньне калгаснай уласнасьці і распальваньне спэкуляцыйных імкненьняў сярод аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Там, дзе партыйная арганізацыя, згубіўшы клясавую пільнасьць, ня бачыць гэтых манэўраў і хітрыкаў кулака, не змагаецца з ім з усёй рашучасьцю, абапіраючыся на калгасны і бядняцка-серадняцкі актыў, там кулаку ўдаецца шкодзіць загатоўчай рабоце.

Пастановы бюро ЦК зьяўляюцца **сур'ёзнай перасьцярогай для ўсіх апартуністаў і прымірэнцаў.**

Вышэй клясавую пільнасьць! Узьнімаючы актыўнасьць калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас у барацьбе супроць рэштак кулацтва, рашуча прыдушаючы кулацкае супраціўленьне і сабатаж, ачысьціўшы загатоўчы апарат ад кулацкіх агентаў і павысіўшы яго адказнасьць за работу, бальшавікі БССР атрымаюць поўную перамогу на загатоўчым фронце, завяршыўшы загатоўкі ўсіх асноўных відаў сельска-гаспадарчай прадукцыі ва ўстаноўленыя сьнежаньскім пленумам ЦК КП(б)Б тэрміны.

З бальшавіцкай упартасьцю змагацца за перамогу на фронце збожжазагатовак

Ад партарганізацый патрабуецца неаслабная пільнасьць да манэўраў клясавага ворага і яго агентаў

ДРУГІ БАЯВЫ ЭКЗАМЭН

(АД НАШАГА СПЭЦЫЯЛЬНАГА КАРЭСПАНДЭНТА)

Рагачоўскі раён атрымаў першую прэмію за пасьпяховае скончаньне адгрузкі бульбы Ленінграду. Атрымаўшы найбольш вялікі плян, раён, на аснове мабілізацыі мас калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў, дабіўся адгрузкі ў тэрмін, вызначаны партыяй і ўрадам.

Але, змагаючыся за бульбу, раённыя арганізацыі і сельсаветы значна аслабілі барацьбу на фронце збожжазагатовак. Гэта з усёй выразнасьцю ілюструюць наступныя лічбы: калі за кастрычнік прырост складаў 19,1 проц. (лічба бязумоўна нездавальняючая), дык на працягу лістапада загатоўлена яшчэ менш—усяго 7,9 проц. Такім чынам у лістападзе тэмпы загатовак рэзка зьнізіліся.

Загадчык рагачоўскай міжраённай канторы Загатзбожжа тав. ФРУМЯНКОЎ проста тлумачыць, што «аднэй з асноўных прычын зацяжкі здачы збожжа зьяўляецца тое, што мы былі заняты адгрузкай бульбы». Іншымі словамі, гэта была стаўка на чарговасьць кампаній: «пакончым з бульбай, тады возьмемся за збожжа».

Раённыя работнікі настроены аптымістычна: нічога, плян будзе выканан. Аднак, мы ня можам згадзіцца з аптымізмам раённых кіраўнікоў, бо іх настроі не падмацаваны рэальнымі справамі, у даным выпадку сотнямі цэнтнэраў збожжа, якія яшчэ недаданы дзяржаве.

Адгрузка бульбы скончылася 24 лістапада. З таго часу прайшло каля 2-х дэкад, якія ня толькі не далі пералому ў збожжазагатоўках, але, наадварот, прынесьлі яшчэ большае зьніжэньне тэмпаў. Вось лічбы прыросту за тры пяцідзёнкі: з 25 лістапада да 1 сьнежня — 0,7 проц. гадавога пляну, з 1 да 5 сьнежня—0,8 проц., з 5-га да 10-га—0,8 проц. Аб чым гавораць гэтыя лічбы, калі не аб дэмабілізацыйных настроях, аб некаторым галавакружэньні ад «посьпехаў» у сувязі з пераможным завяршэньнем адгрузкі: «Нічога, мы ўсё можам».

Дагэтуль яшчэ ні адзін сельсавет у раёне ня выканаў поўнасьцю заданьне. Нават калгасны сэктар ніяк ня можа ліквідаваць «хвасты» ў здачы збожжа. На 10 сьнежня калгасы рэалізавалі заданьне на 84,4 проц. (без насенпазыкі). Дзяржаве недадана яшчэ 54,6 тоны. Гэта ў той час, калі ўсе тэрміны даўно прайшлі, калі сотні калгасаў БССР перавыканалі свае пляны.

Але найбольш слабым вучасткам зьяўляецца аднаасобны сэктар. Загатоўлена ўсяго 57,9 проц. пляну, а па паасобных сельсаветах яшчэ менш. Так, па аднаасобным сэктары Курганскага сельсавету заданьне рэалізавана на 36 проц., Мала-Стралкоўскага—на 37,1 проц., Гарадзецкага—на 39,7 проц. і г. д.

«У сельсаветах ёсьць значныя лішкі збожжа»—кажуць раённыя работнікі. Паўстае пытаньне—чаму-ж гэта збожжа не загатаўляецца, і няўжо ня ведаюць раённыя работнікі, што гэтыя лішкі ў радзе выпадкаў вывозяцца на рынак і прадаюцца па спэкуляцыйных цэнах.

Ведаюць, добра ведаюць. У канторы «Загатзбожжа» зарэгістраван рад фактаў спэкуляцыі збожжам: Сачаеў Рыгор (Курганскі сельсавет) вывез на рынак 38 кгр. ячменю, Сідарэнка Ян (В.-Тошчыцкі сельсавет)—100 кгр. аўса, Макарава (Забалоцкі сельсавет)—62 кгр. жыта і інш.

Чаму-ж зьнізіліся тэмпы загатовак у той час, калі ў сельсаветах і калгасах ёсьць вялікія лішкі збожжа?

Няма на Рагачоўшчыне сапраўднай бальшавіцкай барацьбы за збожжа—вось адзіны адказ на гэта пытаньне. Няма тэй упартай барацьбы, якая забясьпечыла бальшавікам Рагачоўшчыны перамогу ў адгрузцы бульбы.

І зусім правільна характарызуе прычыны адставаньня сакратар райкому КП(б)Б тав. ЯЎСЕЕНКА:

— Гэтыя прычыны заключаюцца ў тым, што некаторыя нашы сельсаветы ня здолелі разгарнуць масавай работы вакол збожжазагатовак, не скарыстоўваюць для фарсаваньня тэмпаў пастановы партыі і ўраду аб збожжазагатоўках і калгасным гандлі, а таксама закон ураду аб аднаразовым падатку.—Між-тым гэты закон дае права поўнасьцю і часткова вызваліць ад аднаразовага падатку паасобныя гаспадаркі, якія акуратна выканалі свае абавязкі перад дзяржавай і, наадварот, павышаць стаўкі падатку тым аднаасобным гаспадаркам якія злосна ня выконваюць сваіх абавязацельстваў.

Нарэшце, недастатковы націск на кулацка-заможнія гаспадаркі ў паасобных сельсаветах прыводзіць да зрыву цьвёрдых заданьняў. Даволі паказаць на М.-Стралкоўскі сельсавет, дзе цьвёрдыя заданьні спагнаны ўсяго на 40 проц., Сьвяцкі—на 44,1, Станькаўскі—на 47,3 проц.

Наўрад ці трэба напамінаць тав. Яўсеенку, што за слабую работу гэтых сельсаветаў цалкам адказвае і раённае кіраўніцтва.

Насенпазыка—забыты вучастак у Рагачоўскім раёне. Тут ня ўлічваюць таго, што агульны збожжазагатоўчы плян ня можа быць выкананым поўнасьцю без ліквідацыі запазычанасьці па насенпазыцы.

Некаторыя калгасы не жадаюць вярнуць пазыку, а кантора «Загатзбожжа» цярпліва чакае.

Вось калгас «Бальшавік», Курганскага сельсавету, атрымаў вясной г. г. 30 цэнтн. збожжа, а вярнуць яшчэ не сабраўся. Калгас «Шлях Кастрычніка», Прыбарскага сельсавету, таксама атрымаў 30 цэнтн. збожжа і чакае пакуль... пазыка будзе спагнана судом. Кантора «Загатзбожжа» чамусьці «нянчыцца» з тымі, хто ўпарта ня выконвае сваіх дагавароў. Ня дзіва, што на 10 сьнежня насенпазыка па Рагачоўшчыне спагнана ўсяго на 14 проц. Гэта зьніжае агульны процант выкананьня пляну збожжазагатовак па раёне.

Партыйная арганізацыя Рагачоўскага раёну на збожжазагатоўках трымае баявы экзамэн. Яна павінна яго вытрымаць з гонарам, паказаць такія-ж узоры работы, як і ў барацьбе за адгрузку бульбы Ленінграду.

С. ГАЛКІН.

Партарганізацыя Магілева мабілізавалася на завяршэньне загатовак

МАГІЛЕЎ. (Па тэлеграфу). На сходзе партактыву Магілева быў заслухан даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. ЖАБРОЎСКАГА аб выніках сьнежаньскага пленуму ЦК. Партактыў поўнасьцю ўхваліў пастановы сьнежаньскага пленуму. Адзначыўшы слабы ход загатовак па раёну, партактыў абвясьціў дэкаднік штурму для ліквідацыі прарыву ў загатоўках збожжа і льну. Партактыў абавязаўся выканаць пляны загатовак да 25 сьнежня. Мабілізавана 60 чал., якія ўжо выехалі на раён.

Н.

На 60-м месцы

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Той факт, што Гомельскі раён займае шасьцідзесятае месца ў калёне барацьбітоў за збожжа, ужо гаворыць аб тэмпах загатовак па раёне. Апошняя дэкада сьнежня не дала ніякага зруху. Прырост складае ўсяго 2,5 проц.

Толькі 4 сельсаветы з 23-х (Карналінскі, Урыцкі, Давыдаўскі і Прыбарскі) набліжаюцца да поўнага выкананьня гадавога пляну. Самым адсталым зьяўляецца **Мельчацкі** сельсавет. Ня гледзячы на тое, што сельсавет атрымаў зусім невялікі плян — усяго 3 тоны, — ён на 10 сьнежня выканаў плян збожжазагатовак на 32,1 проц., а па аднаасобным сэктары — толькі на 8,1 проц.

Кіраўнікі сельсавету, на чале з старшынёй **Баранавым** і сакратаром парт'ячэйкі **Сакам,** пытаньнем збожжазагатовак займаюцца толькі тады, калі да іх прыяжджае прадстаўнік гаркому партыі.

Старшыня сельсавету нават ня ведае членаў яго. Калі інспэктар «Загатзбожжа» тав. **Вербавікоў** зьвярнуўся да Баранава, каб той вылучыў яму на дапамогу члена сельсавету, дык старшыня два дні шукаў апошняга, не знайшоў яго і, нарэшце, вылучыў сельскага выканаўцу.

Ці можа такое кіраўніцтва забясьпечыць выкананьне пляну?

Член Ціценскага сельсавету **Аксіньня Крычаўцова** сама ня выконвае сваіх самаабавязацельстваў. Аднаасобны сэктар гэтага сельсавету выканаў плян на 31,8 проц.

Члены Раманавіцкага сельсавету **Плотнікаў, Лыскін, Васіленка** проста адмаўляюцца ад усякай работы па загатоўках. У склад сельсавету прабралася група падкулачнікаў, якая падрывае загатоўкі. Гаспадарка чырвонагвардзейца Лыскіна атрымала большы плян, чым заможны серадняк Сьцяпан Шыроў. Старшыня сельсавету **Супееў** самавольна зьняў заданьне з кулацкай гаспадаркі Каналлянікава (ён-жа рахункавод сельсавету).

Апошняя пастанова ЦК УсеКП(б) і СНК аб гандлі збожжам не даведзена да шырокіх мас калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў. Наглядаецца рад выпадкаў спэкуляцыі збожжам на рынку.

Гомельская партарганізацыя павінна ачысьціць свае рады ад кулацкіх элемэнтаў, якія зрываюць важнейшыя мерапрыемствы партыі і ўраду.

Н. Г.

Чаму перамог Самулкаўскі сельсавет

ЧАВУСЫ. Чавускі раён зьяўляецца адным з рашаючых па загатоўках збожжа. Ён адыгрывае вялікую ролю ў выкананьні агульнарэспубліканскага заданьня.

Гэта адно павінна было-б абавязаць раённыя арганізацыі мабілізаваць усе сілы і сродкі па хутчэйшае выкананьне цэнтралізаванага пляну загатовак.

Аднак, ход збожжазагатовак па раёну зусім нездавальняючы. На 10 сьнежня гадавы плян выканан усяго на 44,5 проц. Прырост за цэлую дэкаду складае толькі 2,2 проц.

Раён увесь час знаходзіцца на чорнай дошцы як па бульбе, так і па збожжы. Раённага кіраўніцтва, як відаць, гэта зусім ня турбуе.

Аб тым, што плян цалкам рэальны і раён мае ўсе магчымасьці для хутчэйшага яго выкананьня — ярка пацьвярджае вопыт работы **Самулкаўскага** сельсавету, які першым у раёне скончыў збожжазагатоўкі.

Чаму перамог Самулкаўскі сельсавет?

З самага пачатку кампаніі, пасьля давядзеньня плянаў да калгасаў і населішч, была мабілізавана ўся грамадзкасьць сельсавету.

І з першых-жа дзён сельсавет вышаў на першае месца.

На фронт загатовак былі кінуты лепшыя сілы: партыйная і камсамольская ячэйкі, сельсавецкі і калгасны актыў, партызаны і пераменьнікі.

Шмат дапамог у рабоце добра пастаўлены ўлік выкананьня пляну. Члены сельсавету кожны дзень рэгістравалі здачу збожжа і бульбы аднаасобнымі гаспадаркамі.

Усёй работай па загатоўках кіраваў штаб, складзены з трох асоб. Увесь актыў сельсавету, сумесна з лепшымі здатчыкамі, быў разьбіт на 4 брыгады, якія былі прымацаваны да паасобных вучасткаў.

Штаб штодзенна аператыўна кіраваў усімі вучасткамі. Былі выпушчаны два нумары насьценнай газэты, прысьвечаныя спэцыяльна загатоўкам. Сыстэматычна вывешваліся чырвоныя і чорныя дошкі. Гаспадаркі, занесеныя на чорную дошку, на заўтра-ж выконвалі сваё заданьне.

Шырока было разгорнута сацспаборніцтва паміж паасобнымі брыгадамі і членамі сельсавету на хутчэйшае выкананьне пляну. Толькі за адну пяцідзёнку прырост складае па бульбе 27 проц. і па збожжы 15 проц.

За ўвесь час было арганізавана па сельсавеце 7 масавых чырвоных абозаў.

Пастановы партыі і ўраду аб гандлі збожжам і аднаразовым зборы прапрацаваны на сходах ва ўсіх населішчах. На заўтра-ж пасьля прапрацоўкі гэтага пытаньня на сходзе ў вёсцы Байнілы 92 гаспадаркі са 149 павезьлі збожжа і бульбу на загатоўчы пункт.

Некаторыя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі як: Валоччанка А., Ганчарова М., Акулёва Ул., Спаская М. і інш. з першых-жа дзён выканалі і перавыканалі свае заданьні.

Члены сельсавету **Салаўёў, Алейнікаў, Новікаў** першымі скончылі выкананьне пляну на сваіх вучастках. Узорны прыклад барацьбы за збожжа паказалі партыйцы **Майсеенка, Гукалаў;** партызаны—**Грыгор'еў Ф., Кавалёў, Хомчанка, Сіл[illegible];** камсамольцы — **Ануф[illegible]аў і Капусьцін.**

Парт'ячэйка і сельсавет сумесна з актывам далі рашучы адпор выступленьням кулацка-заможных элемэнтаў, якія імкнуліся сарваць прыняцце плянаў (в. Самулкі). Адразу былі выяўлены месцы, дзе былі схаваны збожжа і бульба цьвёрдазаданьнікаў.

Паасобныя члены сельсавету, кандыдаты партыі **Надзінаў і Зайцаў** і камсамолка **Лодз** не жадалі змагацца за выкананьне пляну, за што атрымалі суровае пакараньне.

Парт'ячэйка і сельсавет далі рашучы адпор апартуністычным разважаньням паасобных членаў партыі аб нерэальнасьці пляну.

У выніку ўсёй гэтай работы, на 1 сьнежня плян загатовак па сельсавеце выканан па збожжы на 105,4 проц., а па бульбе — на 100,1 проц.

Цяпер сельсавет разгарнуў вялікую работу па датэрміновым выкананьні пляну загатовак ільну і мяса.

Бальшавіцкая напружаная работа партыйных, камсамольскіх і савецкіх арганізацый і ўсяго актыву сельсавету, шырокая партмасавая работа сярод калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас аднаасобнікаў, рашучы націск на кулацка-заможныя гаспадаркі — вось прычыны перамог самулкаўцаў на фронце загатовак.

К. С.

Аб мерапрыемствах у сувязі з перадавым артыкулам „Праўды" ў № 333—„Задачы саўгасных і калгасных газэт у новай абстаноўцы"

Пастанова ЦК КП(б)Б

1. ЦК КП(б)Б падкрэсьлівае выключную важнасьць неабходнасьці неадкладна забясьпечыць перабудову работы ўсяго нізавога сельскага друку ў адпаведнасьці з новымі абставінамі ў вёсцы.

2. Канстатуючы значнае аслабленьне за апошнія месяцы ўвагі з боку раду цэнтральных, раённых газэт, раённых партыйных арганізацый і асабліва партыйных ячэек да пытаньняў рабселькораўскага руху і нізавога друку, ЦК ставіць перад усімі ГК, РК КП(б)Б, партыйнымі ячэйкамі і рэдакцыямі цэнтральных і раённых газэт задачу няўхільнага змаганьня за выкананьне ўсіх раней прынятых пастаноў аб нізавым друку і рабоце з рабселькорамі.

Асаблівая завостраная ўвага павінна быць сканцэнтравана: а) на забесьпячэньні СЫСТЭМАТЫЧНАГА і глыбокага партыйнага кіраўніцтва газэтамі ў саўгасах, МТС, калгасах і калгасных брыгадах, якія зараз «...важнейшы вучастак, маючы выключнае значэньне ва ўсёй рабоце партыі на вёсцы» («Праўда»). КОЖНАЯ насьценная газэта павінна быць забясьпечана моцным партыйным кіраўніцтвам. Неабходна ўзмацніць клясавую пільнасьць рэдактароў і ўсёй масы рабселькораў. Неабходна рашуча ўзьняць самую актыўную ролю ўсяго нізавога друку ў барацьбе з кулацтвам і кулацкай агентурай у радах партыі—апартуністамі, у прыватнасьці сваячасова і бязьлітасна выкрываючы спробы клясавага ворага пралезьці ў рады рабселькораў, скарыстаць друк—вайстрэйшую зброю партыі; шырока і сваячасова выкрываючы манэўры клясавага ворага; б) на аказаньні асабліва шырокай дапамогі газэтам МТС і саўгасаў з тым, каб кожная з іх на справе зьяўлялася АПОРНАЙ і ВЯДУЧАЙ газэтай для сельскага нізавога друку; в) на рашучым паляпшэньні якасьці агляду друку ў цэнтральных і раённых газэтах; г) на правядзеньні сыстэматычнай работы па марксыцка-ленінскім выхаваньні рабселькораў.

3. У сувязі з перадавым артыкулам «Праўды» («Задачы саўгасных і калгасных газэт у новай абстаноўцы») ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

а) 25 студзеня 1933 г. правесьці ў КП(б)Б адзіны партыйны дзень усіх ячэек, прысьвечаны пытаньню ўзмацненьня партыйнага кіраўніцтва нізавым друкам і работаю сярод рабселькораў. На адкрытых сходах ячэек з шырокім прыцягненьнем рабселькораў і спэцыялістаў прапрацаваць перадаваны артыкул у нумары 333 газэты «Праўда» і заслухаць даклады бюро ячэек, рэдкалегій газэт аб выкананьні папярэдніх пастаноў ячэйкі, РК і ГК аб друку і вызначыць канкрэтныя мерапрыемствы па рашучым паляпшэньні партыйнага кіраўніцтва нізавым друкам і рабселькорамі, з папярэднім выпускам самаправерачных брыгад. Даручыць аргаддзелу і Культпропу ЦК выдаць зборнік матар'ялаў у дапамогу парт'ячэйцы пры правядзеньні партдня; б) лічыць неабходным перадрукаваньне цэнтральнымі і раённымі газэтамі БССР перадавога артыкулу «Праўды» (№ 333); в) абавязаць рэдакцыі газэт БССР неадкладна ўключыць у пляны сваёй работы разгорнутае ажыцьцяўленьне мерапрыемстваў, якія вынікаюць з установак перадавога артыкулу, і шырока асьвятляць падрыхтоўку да ўсебеларускага партдня; г) абавязаць ГК і РК КП(б)Б у двухдэкадны тэрмін заслухаць даклады рэдакцый раённых газэт і асобных партыйных ячэек пад кутом праверкі выкананьня папярэдніх пастаноў РК, дырэктыў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб нізавым друку і рабселькораўскім руху; д) заслухаць на адным з бліжэйшых пасяджэньняў сакратарыяту ЦК КП(б)Б даклады двух РК КП(б)Б аб выкананьні пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб кіраўніцтве нізавым друкам і рабселькораўскім рухам; е) у лютым на сакратарыяце ЦК заслухаць даклад аргінстру і культпропу ЦК аб выніках правядзеньня ўсебеларускага партдня; ж) шырока адзначыць у друку БССР дзесяцігодзьдзе з дня існаваньня вясковага нізавога друку; з) даручыць культпропу і аргінстру ЦК скласьці ліст аб мэтадах падрыхтоўкі і правядзеньня ўсебеларускага партдня.

МЕНШЧЫНА ПЕРАВЫКАНАЛА ПЛЯН МЯСАЗАГАТОВАК

Гаркому партыі, гарсавету, Белзагатжывёле, газэце „Зьвязда"

РАПАРТ

Пад правільным кіраўніцтвам гарадзкога камітэту партыі, шляхам ужываньня бальшавіцкіх мэтадаў работы, пры мабілізацыі калгасных бядняцка-серадняцкіх мас, Менскі раён на 15 сьнежня перавыканаў плян мясазагатовак 4-га кварталу. Замест 2.866,6 цэнтн. здана 2.984,7 цэнтн., што складае 105,1 проц. пляну.

Менская кантора загатжывёлы абяцае і надалей не аслабляць тэмпаў работы па выкананьні пляну першага кварталу 1933 г.

Мензагатжывёла БЕРМАН.

ГАДАВЫ ФІНПЛЯН ПЕРАВЫКАНАН

ЦК КП(б)Б—Гікале, СНК БССР—Галадзеду, Наркамфін—Хацкевічу, ЦП ФБР—Кайкову, газэтам—„Зьвязда" і „Савецкая Беларусь"

СІРОЦІНА. (Па тэлегр.).

Пад ленінскім кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і раённай партыйнай арганізацыі ўзятыя на сябе абавязкі Сіроцінскі раён выканаў. Па становішчы на 16 сьнежня плян мабілізацыі сродкаў 4-га кварталу выканан на 101,2 проц., гадавы фінансавы плян—на 111,2 проц., даходная частка бюджэту—на 106 проц. Змагаемся за далейшае перавыкананьне фінпляну.

Сакратар райкому БАНДАРЭНКА.
Старшыня райвыканкому РАЖНОЎСКІ.
Загадчык райфа ЯШКІН.
Старшыня РМФБР ВАСІЛЕЎСКІ.

Да 1 студзеня выканаць 80 проц. пляну ільназагатовак

Ільнамялкам—кругласутачную нагрузку

ХОД ЗДАЧЫ ІЛЬНАВАЛАКНА—ГАЛОЎНЫ ПАКАЗАЛЬНІК РАБОТЫ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ ІЛЬНАВОДЧЫХ РАЁНАЎ

Сельсавет іх ня турбуе

ПЛЕШЧАНІЦЫ. (Наш кар.). Кіраўнікі Ізьбіцкага сельсавету на пытаньне аб ходзе ільназагатовак адказваюць: «Усё разам нельга». І сапраўды практыка работы гэтага сельсавету паказвае, што тут ня здолелі спалучыць масавай работы па збожжазагатоўках з выкананьнем пляну здачы ільнавалакна і пянькі.

Таму становіцца зусім зразумелым, чаму гэты сельсавет выканаў плян толькі на 13 проц.

Чарговасьці кампаній і самацёку прытрымліваюцца ня толькі ў Ізьбіцкім сельсавеце. З 87 калгасаў раёну плян здачы ільнавалакна выканалі толькі 9.

На 14 сьнежня здана: ільнавалакна 20,5 тоны — 23 проц., ільнянога семя — 19,3 тоны, або 14,4 проц. Гэтыя лічбы лепш за ўсё паказваюць, што раённыя арганізацыі ня здолелі арганізаваць перапрацоўку і здачу ільнавалакна як у калгасным, так і ў аднаасобным сэктары.

У калгасах **«Чырвоны маяк» і «Прафінтэрн»** ільнамялкі прастойваюць цэлымі днямі, бо сваячасова не падрыхтован апал для сушкі ільну ў ёўнях. Ільнамялкі разьмеркаваны паміж калгасамі нераўнамерна. У адных калгасах ёсьць лішнія, а ў другіх не хапае. Дагэтуль не ўрэгулявана пытаньне аб прымацаваньні калгасаў, якія ня маюць мялак, да суседніх мяльна-сушыльных пунктаў.

У калгасах **імя Валадарскага і «Новае жыцьцё»** выяўлены нават факты псаваньня ільну.

Нарэшце, аб выкананьні цьвёрдых заданьняў. У раёне нават **няма ўліку кулацка-заможных гаспадарак і штодзённага кантролю за здачай імі ільнавалакна.** Па Крайскім, Аколаўскім, Хатаевіцкім і Запольскім сельсаветах цьвёрдыя заданьні спагнаны толькі ад 7 да 13 проц. Заможніца **Брынкіна** з вёскі Белая, Запольскага сельсавету, не здала ні аднаго кілё ільнавалакна і вядзе агітацыю за зрыў ільназагатовак. Сельсавет ня ўжывае ніякіх мер у адносінах да яе.

Цьвёрдазаданцы **Залуцкі і Далёнак,** Аколаўскага сельсавету, выканалі плян збожжазагатовак на 40 проц., ільну зусім не здалі. Сельсавет іх ня турбуе.

Калгасы **«Чырвоны транспарт» і «Ільліч»,** добра арганізаваўшы перапрацоўку ільну ўручную, ужо перавыканалі плян здачы ільнавалакна. Практыка гэтых калгасаў паказвае, што Плешчаніцкі раён можа і павінен у бліжэйшыя дні пакрыць сваю запазычанасьць дзяржаве.

Модлін.

Чаму адстае Гарадокшчына

16,5 проц. выкананьня ільназагатовак — атэстат работы гарадоцкіх арганізацый. Безгаспадарчыя адносіны да апрацоўкі ільну, дзялёжка валакна да выкананьня плянаў у калгасах Гарадокшчыны — вось прычына адставаньня.

У калгасе **«Чырвоны Перакоп»,** Пальмінскага сельсавету, лён яшчэ на сьцелішчы. Кіраўніцтва калгасу падпала пад уплыў кулацкай агентуры, а раённыя арганізацыі толькі фіксуюць факты, ня ўжываючы ніякіх мер.

У калгасе **«Бальшавіцкая вясна»** здача ільну не распачата, а між іншым ужо разьмеркавана добрая частка ільну сярод калгасьнікаў.

Прамтавары, а таксама і другія стымулы, даныя ўрадам для паскарэньня апрацоўкі ільну і загатовак, не скарыстаны ў Гарадоцкім раёне. Праўленьне калгасу «Чырвоны сьцяг», атрыманую прэмію на ільназагатоўкі разьмеркавала сярод сваіх сваякоў і знаёмых, а не сярод тых калгасьнікаў, якія былі заняты на ўборцы ільну.

У рэзультаце калгас нават не распачаў апрацоўкі ільну. Што гэта, выпадкова? Не. Старшыня праўленьня калгасу «Чырвоны сьцяг» **Буйноў** — заможнік, ён дапусьціў гэта сьвядома, каб сарваць апрацоўку ільну.

Гарадоцкі раён займае **другое** месца ў рэспубліцы па размерах ільназагатоўчага пляну. 1.570 тон валакна — такі доўг калгасаў і аднаасобнікаў Гарадокшчыны перад дзяржавай. Гэта абавязвае гарадоцкую партарганізацыю зламаць супраціўленьне кулацкіх агентаў ільназагатоўкам, скарыстаць ільготы ільназдатчыкам для паскарэньня апрацоўкі ільну.

Патураюць кулаком і заможнікам

Сіроціна з даўняга часу зьяўляецца ільнаводчым цэнтрам БССР. Значная частка сіроцінскага ільну ідзе на экспарт. У гэтым годзе калгасы і аднаасобнікі Сіроцінскага раёну павінны здаць 1.100 тон ільнавалакна. Плян гэты зусім рэальны. Патрэбна толькі бальшавіцкая арганізаванасьць і настойлівасьць для яго выкананьня.

Аднак, практыка работы раённых арганізацый за апошні час паказвае, што ў Сіроціне зусім не арганізавана барацьба за лён. **Апарат «Райзагатільну» фактычна зьвёў свае функцыі толькі да ролі прыёмшчыкаў.** Тры інструктары і 4 спэцыялісты канторы «Загатільну» бязьдзейнічаюць. Ні адзін з іх не выяжджае ў калгасы і сельсаветы, каб на месцы дапамагчы арганізаваць перапрацоўку і сартыроўку ільну, а гэта бязумоўна значна паскорыла-б тэмпы здачы ільну.

Характэрна, што райснаб дагэтуль не давёў аператыўных плянаў загатовак ільну да сельсаветаў і калгасаў. Гэта прывяло да рэзкага зьніжэньня ходу загатовак. Раён павінен штодзенна здаваць 35 тон ільнавалакна, між тым за 5 дзён — з 5 па 10 сьнежня — на пункты паступіла толькі 31 тона.

У паасобных сельсаветах наглядаецца патураньне кулацка-заможным гаспадаркам, якія ўтойваюць лён. Так, па **Жарабіцкім** сельсавеце плян ільназагатовак выканан толькі на 10,4 проц. Цьвёрдыя заданьні кулацка-заможнай часткі не спагнаны. Сельсавет і парт'ячэйка (сакратар парт'ячэйкі Ляткоўскі) пытаньнямі перапрацоўкі і здачы ільну ня цікавяцца. Ільготы ільназдатчыкам сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў не папулярызаваны.

Сіроцінскі раён мае ўсе ўмовы для таго, каб у бліжэйшы час выканаць плян ільназагатовак. Для гэтага патрэбна рашучая бязьлітасная барацьба з кулацка-заможнымі элемэнтамі вёскі і разгортваньне масавай работы сярод калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў.

Б—ін.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

Аб выніках сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б

З пастановы сходу партактыву г. Менску па дакладу тав. Галадзеда

Заслухаўшы і абгаварыўшы даклад тав. Галадзеда аб выніках сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б, менскі гарпартактыў цалкам ухваляе гэтыя пастановы і поўнасьцю да іх далучаецца.

Разгортваючы сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце, няўхільна ажыцьцяўляючы генэральную лінію партыі, рабочая кляса і калгаснае сялянства БССР, пад кіраўніцтвам КП(б)Б на чале з ЦК і пры брацкай дапамозе пралетарыяту СССР, атрымалі рашаючыя посьпехі ў справе індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Сьнежаньск пленум ЦК КП(б)Б, сабраўшыся на гістарычным рубяжы дзьвёх пяцігодак, намеціў баявую праграму дзейнасьці па мабілізацыі працоўных мас гораду і вёскі на вырашэньне чарговых задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Гарпартактыў заклікае ўсю партыйную арганізацыю і ўсе працоўныя масы вёскі і гораду безадкладна, па-баявому ўзяцца за ажыцьцяўленьне дырэктыў пленуму ЦК КП(б)Б па ўзьняцьці якасьці сельскага гаспадараньня, па ўкараненьні агратэхнікі і сваячасовай падрыхтоўцы да надыходзячай веснавой пасеўнай кампаніі. Неабходна разгарнуць шырокую бальшавіцкую работу ў масах, мабілізуючы калгасьнікаў, рабочых саўгасаў і працоўных аднаасобнікаў на ажыцьцяўленьне ўсіх тых канкрэтных мерапрыемстваў, якія вызначаны пленумам ЦК і пленумам Менгаркому КП(б)Б.

Барацьба за агратэхніку — гэта магутны вагар, важнейшая частка разгорнутага сацыялістычнага наступленьня на вёсцы ў новай абстаноўцы, у новых умовах. Барацьба за якасьць сельскай гаспадаркі ёсьць зараз стрыжнявое пытаньне арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і бязьлітаснага змаганьня з рэшткамі кулацтва і яго агентурай.

Партактыў лічыць, што толькі ў рашучай барацьбе з кулацтвам і яго агентурай, у рашучай барацьбе з правым апартунізмам, з «левакамі» і рэшткамі контр-рэвалюцыйнага трацкізму мы забясьпечым выкананьне пастаноў пленуму па ўздыме прадукцыйнасьці сельскай гаспадаркі.

На аснове правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі БССР дабілася выключных посьпехаў у справе будаўніцтва савецкай палітэхнічнай і вышэйшай школы. Толькі за гады першай пяцігодкі сетка масавых школ павялічылася на 1.200, а колькасьць навучаючыхся ўзрасла амаль у 2 разы і дасягнула зараз да мільёна чалавек.

Сетка вышэйшых навучальных установаў вырасла за пяцігодку з 4-х да 32-х, а тэхнікумаў—з 30 да 130.

Пад кіраўніцтвам КП(б)Б магутна разьвіваецца нацыянальная па форме і сацыялістычная па зьместу беларуская культура і культура іншых нацыянальнасьцяй; растуць пралетарскія кадры карэнных нацыянальнасьцяй БССР, у прыватнасьці беларускія пралетарскія кадры.

Гарпартактыў лічыць, што дасягнутыя посьпехі ў галіне стварэньня беларускай культуры і пралетарскіх кадраў БССР ніколькі не павінны зацямняць і тых недахопаў, якія мы маем у галіне разьвіцьця масавай школы і падрыхтоўкі кадраў. Гарпартактыў вітае бальшавіцкую пастанову ЦК і Менгаркому КП(б)Б, якая накіравана на ўсямернае павышэньне якасьці навучаньня ў ВНУ і тэхнікумах і баявую рэалізацыю пастаноў ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б і ЦВК СССР аб перабудове работы масавай школы, ВНУ і ВТНУ.

Партактыў асабліва падкрэсьлівае сваячасовае і правільнае завастрэньне ўвагі пленуму ЦК на неабходнасьць больш рашуча змагацца за ўкараненьне беларусізацыі. Трэба аддаць большую ўвагу падрыхтоўцы пралетарскіх кадраў з карэнных нацыянальнасьцяй БССР, асабліва падрыхтоўцы і вылучэньню беларускіх пралетарскіх кадраў.

Посьпехі, дасягнутыя партыяй у галіне культурнага будаўніцтва, у галіне разьвіцьця масавай, сярэдняй і вышэйшай школы, выклікаюць шалёную нянавісьць з боку клясавага ворага і яго агентуры. Гэта патрабуе ўзмацненьня нашай пільнасьці і непрымірымасьці да ўсякіх праяўленьняў і вылазак з боку вялікадзяржаўнага шавінізму — галоўнай небясьпекі ў нацыянальным пытаньні на даным этапе, супроць нацыянал-апартунізму, шавінізму беларускага, яўрэйскага і польскага, антысэмітызму, рашучай барацьбы з усякімі спробамі скрыўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Падкрэсьліваючы яўна нездавальняючы ход збожжазагатовак і іншых цэнтралізаваных загатовак, гарпартактыў лічыць неабходным дабіцца ажыцьцяўленьня пастаноў ЦК КП(б)Б аб поўным выкананьні збожжазагатовак у вызначаныя тэрміны.

Загатоўкі зьяўляюцца плацдармам, на якім разгортваецца зараз клясавая барацьба ў вёсцы. Загатоўкі зьяўляюцца зараз праверкай якасьці работы кожнай партыйнай арганізацыі, кожнага члена партыі. Толькі ў рашучай барацьбе з кулаком і яго агентурай, у бязьлітаснай барацьбе з апартунізмам, мабілізуючы калгасьнікаў і працоўных мас аднаасобнікаў, можна дабіцца сваячасовага і паўсюднага выкананьня пляну збожжазагатовак.

Гарпартактыў вітае бальшавіцкую пастанову пленуму ЦК аб зьняцьці з работы сакратара Жлобінскага райкому Жырыкава і вывадзе яго са складу ЦК. У новых умовах клясавай барацьбы, пры новай расстаноўцы клясавых сіл, вораг зьмяняе сваю тактыку, прыстасоўваецца па-новаму шкодзіць і зрываць выкананьне нашых задач. Апартуністы зараз часта непасрэдна зрошчваюцца, змыкаюцца з клясавым ворагам. Аб гэтым сьведчаць факты, меўшыя месца на Паўночным Каўказе, аб гэтым сьведчыць хадайніцтва сакратара Жлобінскага РК партыі аб аднаўленьні ў правах кулакоў, аб гэтым сьведчыць выступленьне трацкісцкіх груповак у БАН, Мазыры і г. д.

Жорсткае супраціўленьне разгромленых, але яшчэ недабітых капіталістычных элемэнтаў, сустракае падтрыманьне з боку рэштак выкрытага і разьбітага партыяй контр-рэвалюцыйнага трацкізму, а таксама права-апартуністычных і «ляўацкіх» элемэнтаў. Спэкулюючы на труднасьцях росту гэтыя элемэнты прабуюць аднавіць капіталізм у нашай краіне. Аб гэтым лішні раз гаворыць раскрытая контр-рэвалюцыйная групоўка Іванова і інш.

Гарпартактыў заклікае ўсю партарганізацыю ўзмацніць клясавую пільнасьць і бальшавіцкую непрымірымасьць да вылазак клясавага ворага.

Вітаючы пастановы ЦК УсеКП(б) аб чыстцы членаў і кандыдатаў партыі, партактыў лічыць, што ва ўмовах і ў абстаноўцы шалёнага супраціўленьня клясавага ворага, як ніколі, патрабуецца найбольшая маналітнасьць і баяздольнасьць радоў партыі. Гэта абавязвае кожнага члена партыі заўсёды даваць прыклад бязьлітаснай барацьбы з клясавым ворагам і яго агентурай, паказаць прыклады ідэйнай вытрыманасьці і непрымірымасьці ў барацьбе за генэральную лінію партыі.

Сход партактыву даручае бюро ГК КП(б)Б забясьпечыць дэтальную прапрацоўку пастаноў пленуму ЦК КП(б)Б і Менгаркому ва ўсіх партколектывах і ячэйках з прыцягненьнем шырокіх беспартыйных мас кожнага прадпрыемства, МТС, саўгасу, калгасу, установы.

Рашуча адкідаючы свае рады ад чужых, прымазаўшыхся, кулацкіх элемэнтаў, вядучы бязьлітаснае змаганьне на два фронты, руйнуючы супраціўленьне апошніх рэштак клясавага ворага, менская партыйная арганізацыя, як і ўся КП(б)Б, яшчэ шчыльней згуртуе свае рады вакол ленінскага ЦК на чале з нашым правадыром тав. Сталіным і павядзе рабочую клясу і калгасьнікаў наперад, да яшчэ большых перамог у барацьбе за камунізм.

Няхай жыве ленінскае адзінства нашых радоў!

Няхай жыве ленінскі ЦК УсеКП(б)!

Няхай жыве наш правадыр тав. Сталін!

Нахлебнікі ў калгасе зьніжаюць кошт працадня

ЧАВУСКАЯ ЧЭХАРДА

Чавускі раён па выкананьні важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній увесь час знаходзіцца на адным з апошніх месц. Даволі ўказаць, што дагэтуль раён ня выканаў плян загатоўкі бульбы, збожжазагатоўкі выкананы на 10 сьнежня толькі на 55 проц., загатоўкі ільну яшчэ не разгарнуліся.

Калі больш уважліва прасачыць за работай раённых арганізацый і палітычна-эканамічным становішчам раёну, дык адразу робіцца відавочным, што асноўнай прычынай яго адставаньня зьяўляецца тое, што большасьць калгасаў арганізацыйна і гаспадарча не замацаваны.

Гэта цэнтральная задача ў рабоце на вёсцы ня толькі не ўсьвядомлена радам кіруючых работнікаў, але нават сьвядома ці несьвядома груба скажаецца.

Амаль па ўсіх калгасах раёну мае месца разбазараваньне працадзён. Членам сельсаветаў і актывістам, якія па 8-10 і больш дзён у месяц працуюць не ў калгасе, а па заданьнях сельсавету, як правіла, выпісваюцца працадні. Бываюць выпадкі купні працадзён. Старшыня Радомльскага сельсавету ўносіць у калгас 40 руб. у месяц, а яму запісваюцца працадні. У выніку ў радзе калгасаў каштоўнасьць працадня штучна зьніжаецца.

Намесьнік старшыні РВК тав. **Маньшаў** замест таго, каб весьці барацьбу з гэтымі скажэньнямі, заяўляе:

«Што-ж, актывісты табе за прыгожыя вочы будуць працаваць?»

Такога-ж погляду прытрымліваецца і намесьнік старшыні райкому тав. **Фэльдман.** Ня дзіва пасьля гэтага, што рад вясковых актывістаў, калі даведаліся, што працадзён ня будуць запісваць, адмаўляліся ад работы.

Грубыя скажэньні былі дапушчаны і пры размеркаваньні ўраджаю як у часе выдачы авансаў, так і зараз. У калгасе **«Зара»**, Радомльскага сельсавету, воўну і аўчынкі парашылі размяркоўваць не па працаднях, а «па патрэбе».

Партыя вядзе барацьбу супроць адміністраваньня ў калгасах. У сваёй пастанове аб калгасных кадрах ЦК УсеКП(б) забараніла зьнімаць старшынь калгасаў без дазволу Калгасцэнтру. Але гэта дырэктыва, відаць, не датычыць Чавускі раён. У адным толькі Радомльскім сельсавеце за кастрычнік-лістапад зьменены чатыры старшыні калгасаў, а калгассаюз аб гэтым і ня ведаў. Ячэйка-ж заявіла, што яна ня зьнімала старшынь, а проста «распараджалася кандыдатамі партыі».

Бяз згоды праўленьня ў калгасе імя Леніна, ячэйка зьнімае рахункавода і назначае на яго месца загадчыка ашчаднай касы, які прыходзіць у калгас толькі, каб перапачаваць. За гэта яму налічваюць 20 працадзён.

Зразумела, такой чэхардой, такімі мэтадамі кіраўніцтва нельга замацаваць калгасы. Але-ж раённае кіраўніцтва ня сумуе. Сакратар РК тав. **Багун** знайшоў іншы шлях. На нарадзе старшынь калгасаў у Чавусах ён заявіў: «У бліжэйшы час мы націсьнем ва ўсе кнопкі на аднаасобніка, а калі ён будзе скардзіцца, мы яму скажам — ідзі ў калгас».

Гэтым «мэтадам» калектывізацыі адпавядаюць і «мэтады» загатовак.

Побач з «ляўацкімі» загібамі і адміністраваньнем у адносінах да калгасаў і працоўных аднаасобнікаў, у Чавускім раёне прымірэнча адносіліся да кулакоў. Напрыклад, раённы суд штрафуе кулакоў-заможнікаў, злосных зрыўшчыкаў загатовак у суме... 100 руб.

Адставаньне Чавускага раёну—зьявішча невыпадковага парадку. У аснове яго ляжыць няправільнае праламленьне важнейшых дырэктыў партыі аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў і падмене масава-палітычнай работы як у калгасах, так і аднаасобным сэктары голым адміністраваньнем

А. Вайцэх.

Разбазарваюць працадні

БЯГОМЛЬ. Пленум ЦК КП(б)Б паставіў у цэнтр увагі партыйных і зямельна-калгасных арганізацый барацьбу супроць разбазарваньня працадзён у калгасах, абавязаў РК, зямельна-калгасныя органы дабіцца скарачэньня адміністрацыйна-кіруючых выдаткаў да 1,5-2 проц.

Адміністрацыйна-кіруючы склад калгасаў незалежна ад колькасьці наяўных яму працадзён не павінен атрымаць вышэй тэй колькасьці натуральнай прадукцыі, якую адтрымлівае ў сярэднім у даным калгасе лепшы ўдарнік, добрасумленна выконваючы ўсе даручаныя яму работы.

Але-ж у Бягомльскім раёне пры размеркаваньні ўраджаю і даходаў старшыні і рахункаводы атрымліваюць больш натуральнай прадукцыі нават за лепшага калгасьніка-ўдарніка.

Масава-растлумачальная праца вакол гэтага пытаньня ў раёне не вядзецца. РК КП(б)Б і райвыканкам не даюць адпору рвацкім тэндэнцыям паасобных кіраўнікоў калгасаў. Пастановы партыі і ўраду аб размеркаваньні даходаў і ўраджаю ў калгасах не растлумачаны.

Нельга абыйсьці моўчкі і такі факт. РК і РВК замест барацьбы са скажэньнямі дырэктыў партыі ў размеркаваньні даходаў і ўраджаю самі дапусьцілі грубую памылку. Паводле пастановы РК КП(б)Б і РВК працаўнікі сельсаветаў і сакратары парт'ячэек, якія ня маюць непасрэдных адносін да калгаснай вытворчасьці, зьняты з забесьпячэньня райспажыўсаюзу і прымацаваны да паасобных калгасаў.

Такім чынам кожны калгас павінен забясьпечыць 4-5 чал., што ў значнай меры зьніжае кошт працадня калгасьніка.

Дапушчаныя памылкі з боку РК КП(б)Б і РВК, а таксама і паасобнымі калгасамі, павінны быць зараз-жа выпраўлены (Белта).

Што атрымаў Марцынкевіч у калгасе

ЛАГОЙСК. Папярэдняе размеркаваньне даходаў у калгасах на шматлікіх фактах паказвае рост дабрабыту калгасьніка ў параўнаньні з аднаасобнай гаспадаркай.

Калгасьнік арцелі **«Прафінтэрн»**, Астрашыцкага сельсавету, **Марцынкевіч Даніла** да ўступленьня ў калгас зьяўляўся беднякам, меў аднаго каня і адну карову. Дробнай жывёлы зусім ня было. Свайго хлеба хапала толькі да каляд.

Зараз у калгасе з трыма працаздольнымі членамі сям'і **Даніла** выпрацаваў 660 працадзён. На адзін працадзень у калгасе **«Прафінтэрн»** прыпадае: жыта—3,29 клг., ячменю — 0,49 клг., пшаніцы — 0,47 клг., бульбы — 2,82 клг і грашыма 52 кап.

Такім чынам калгасьнік Марцынкевіч атрымлівае: жыта **130 пудоў**, ячменю — 22 пуды, пшаніцы — 20 пудоў, бульбы — 116 пудоў і 330 руб. грашыма. Апрача гэтага, са сваёй сядзібы Даніла атрымаў 30 пудоў ячменю, 250 пудоў бульбы і мае сваю гародніну.

Калгасьнік Даніла цяпер заяўляе: **«Я такіх прыбыткаў ня меў за 5 гадоў, будучы аднаасобнікам.** Сельска-гаспадарчых прадуктаў для маёй сям'і аж за лішня і я думаю прадаць частку на калгасным кірмашы. Зараз кармлю трое сьвіней, выканаю дзяржаўныя абавязкі па мясу і адну сьвіньню прадам на кірмашы».

(Белта).

Паскорыць зварот таварнага вагона!

МАБІЛІЗАВАЦЬ МАСЫ НА РЭАЛІЗАЦЫЮ ЗАГАДУ НАРКОМА

Зварот вагона мае рашаючае значэньне ў справе выкананьня пляну асеньне-зімовых перавозак. Дрэнны зварот вагонаў паніжае пагрузку, затрымлівае перавозку грузаў для сацыялістычнай прамысловасьці і г. д. Між тым іменна на гэтым вучастку — якасьць скарыстаньня рухомага складу, зварот вагонаў — яўна нездавальняючы. Вось лічбы за лістапад. Па **Аршанскім** раёне заданьне па звароту вагонаў выканана на 85,4 проц., **Віцебскім** раёне — 86,09 проц., **Гомельскім** — 96,9 проц. і **Жлобінскім** — 99 проц.

Дзе прычыны невыкананьня заданьня па большасьці раёнаў БССР?

Прычыны перш за ўсё ў дрэннай рабоце службы эксплёатацыі, у вялікіх прастоях вагонаў на абменных і тэхнічна-распарадчых станцыях.

Разам з цягавікамі посьпех выкананьня пляну асеньне-зімовых перавозак вырашаюць работнікі эксплёатацыі і руху. Станцыі яшчэ працуюць бяз пляну. Прастоі вагонаў — не адзінкавыя выпадкі. Раёны слаба кіруюць станцыямі. Маршрутызацыя, якая, як быццам праводзіцца і ня дрэнна, ідзе часам на змарку, бо па першай-жа сартыровачнай станцыі маршрутныя саставы перафармоўваюцца. Не ліквідаваны яшчэ выпадкі прыбыцьця цягнікоў цэлымі пачкамі.

Характэрна, што ў **Віцебскім** раёне, дзе так нядобра стаіць справа са зваротам, пры праверцы выяўлена больш 500 лішніх таварных вагонаў. Гэты злачынны факт зрыву рэгуліроўкі таварнага парку фактычна б'е па звароту вагонаў па ўсёй МББ. Няма сумненьня, што вінаватыя будуць сурова пакараны.

Пытаньне паляпшэньня звароту вагона — важнейшае пытаньне дня. Нарком тав. **Андрэеў** у сваім загадзе ад 21 лістапада зусім выразна паставіў задачу: **«Барацьбу за паляпшэньне звароту вагона, яго хутчэйшае прасоўваньне з грузам і парожняком зрабіць цэнтральнай задачай усёй штодзеннай работы».** Нарком загадаў да 15 сьнежня зьнізіць усякага роду прастоі вагонаў ня менш чым да вызначаных норм.

Сакратарыят ЦК КП(б)Б у спэцыяльнай пастанове ад 1 сьнежня прызнаў нездавальняючым зварот вагонаў у **Жлобінскім, Аршанскім і Віцебскім** раёнах (за першую пяцідзёнку лістапада). Сакратарыят ЦК зьвярнуў увагу ўсіх партыйных і прафсаюзных арганізацый чыгуначнага транспарту, усіх ГК і РК на асабліва важнае гаспадарча-палітычнае значэньне загаду наркамшляху тав. Андрэева аб звароце таварных вагонаў.

Загад патрабуе ліквідацыі прыбыцьця цягнікоў да распарадчых станцый цэлымі пачкамі, праводзячы ўвесь рух па графіку і раскладу. Правільнае фармаваньне і паляпшэньне маршрутызацыі, барацьба з частымі і паўторнымі сартыроўкамі саставаў цягнікоў на станцыях, — усё гэта меры барацьбы за павялічэньне звароту вагонаў. Кожная тэхнічна-распарадчая станцыя павінна распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па барацьбе з прастоямі вагонаў пад грузавымі апэрацыямі і з чаканьнем падачы вагонаў у рамонт. У мэтах ліквідацыі самацёку ў рабоце станцыі, унясеньня выразнасьці і плянавасьці ў іх працу на тэхнічна-распарадчых сартовачных станцыях уводзяцца кароткія дыспэтчарскія даклады ў начальніка станцыі.

Сакратарыят ЦК КП(б)Б абавязаў ГК, РК, партарганізатараў і ўсе парт'ячэйкі транспарту разгарнуць шырокую растлумачальную працу сярод рабочых аб значэньні загаду ў справе найхутчэйшага паляпшэньня звароту вагона і поўнага выкананьня пляну сутачнай пагрузкі. У цэхах, па брыгадах павінны быць праведзены спэцыяльныя сходы для абмеркаваньня загаду і прыняцьця канкрэтных прапаноў па практычным яго ажыцьцяўленьні. Пастанова сакратарыяту ЦК прапануе, каб партыйна-масавую работу ў парт'ячэйках, партгрупах і сярод рабочай масы сканцэнтраваць на рашучым змаганьні супроць прастояў вагонаў на станцыях абмену пад абменнымі апэрацыямі, за сваячасовы тэхнічны агляд, супроць затрыманьня ў падачы вагонаў пад пагрузку і выгрузку, за адпраўленьне цягнікоў па графіку і па раскладу. ЦК патрабаваў ад усіх партыйцаў, якія працуюць у эксплёатацыйных органах і службе руху, і ўсіх партыйных і прафсаюзных арганізацый на чыгунцы **дабіцца павялічэньня карыснай работы вагонаў.** Разам з тым ЦК даручыў НК РСІ праверыць работу кліентуры чыгункі з тым, каб прыцягнуць да адказнасьці тых, якія затрымліваюць рухомы склад пад пагрузкай і выгрузкай звыш устаноўленых норм.

Загад наркома і пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б — разгорнутая праграма барацьбы чыгуначных арганізацый на чале ўсіх рабочых чыгункі за павялічэньне звароту вагонаў, за выкананьне пляну перавозак. Рэалізацыя загаду наркома і пастановы ЦК — неадкладная задача.

Вагоны прастойваюць на станцыях

На Гомельскім чыгуначным раёне яшчэ не ўзяліся як належыць за выкананьне загаду тав. Андрэева аб павышэньні звароту таварных вагонаў.

Між тым, за апошні час значна паменшыўся зварот і прабег, панізілася карысная работа вагонаў. Сярэдня-сутачны прабег таварнага вагону пры заданьні ў 170 клм. выканан у лістападзе на 147,5 клм. Зварот таварнага вагона выканан на 96,9 проц. Карысная работа вагона пры заданьні 8,8 гадзін раўнялася ў лістападзе 7,6 гадзін, або 86,4 проц. заданьня.

Пагоршаньне тлумачыцца тым, што работа станцый яшчэ не перабудавана. Існуе бясплянавасьць у іх рабоце. Адсутнічаюць сутачныя пляны.

На станцыі **Гомель** вельмі часта вагоны доўга прастойваюць, чакаючы разгрузкі і пагрузкі. 30 лістапада, напрыклад, вагоны №№ 123340, 255082 і 125345 непрадукцыйна прастаялі 45 гадзін. Чатыры вагоны з мясам і маргарынам былі адпраўлены замест 30 лістапада толькі 2 сьнежня. Вагон № 145985 у адрас Масквы прыбыў з Чарнігава на ст. Гомель 23-га, а адпраўлен 26 лістапада, прастаяўшы звыш 84 гадзін. Вагоны з бульбай прастойваюць на станцыях **Нова-Беліцы і Гомель** на 25-30 гадзін.

Нявыразная работа станцый, кліентуры, таварнага двара, дыспэтчараў,—усё гэта перашкаджае поўнаму скарыстаньню вагонаў.

Гомельскі чыгуначны раён, які дабіўся значных посьпехаў у справе аздараўленьня паравознага і вагоннага парку, мае ўсе магчымасьці для зьніжэньня непрадукцыйных прастояў і павялічэньня звароту вагонаў.

Г. Н.

Міх. Вярнікоўскі

Палепшыць партківараўніцтва камсамолам

«Забесьпячэньне кіраўніцтва партыі, ёсьць самае галоўнае і самае важнае ва ўсёй рабоце камсамолу» (СТАЛІН).

Камсамол Саюзу ператварыўся ў шматмільённую арганізацыю, стаўшы магутнейшай «школай рознастайнай дзяржаўнай дзейнасьці, ударнай брыгадай будаўніцтва сацыялізму». Наша бальшавіцкая партыя заўсёды выразна і ясна ставіла і ставіць перад камсамолам задачы яго ўдзелу ў барацьбе за сацыялізм, у той-жа час дае камсамолу максымум самастойнасьці і ініцыятывы ў яго рабоце.

Кіруючыся ўказаньнямі Леніна, партыя, мабілізуючы сваю ўвагу на цэнтральнай задачы—задачы ідэйна-палітычнага выхаваньня камсамолу і ўсёй моладзі, забясьпечвае актыўны ўдзел іх у клясавай барацьбе, у разгорнутым сацыялістычным наступленьні, у выкананьні чарговых гаспадарча-палітычных кампаній.

Пастановы партыі і ўказаньні яе правадыроў выразна акрэсьліваюць задачы партківараўніцтва камсамолам, задачы ленінскага камсамолу.

XV партзьезд у сваіх пастановах запісаў: **«Веданьне камсамольскай арганізацыі, яе штодзеннай работы, неабходная таварыская чуласьць і такт зьяўляюцца ўмовамі правільнага кіраўніцтва».**

Зусім зразумела, што пастановы партыі забясьпечваюць магутныя посьпехі саюзу, вялізарныя посьпехі ў яго барацьбе за генэральную лінію партыі. Штодзенныя клопаты партыі аб сваім вернейшым памочніку—камсамоле далі магчымасьць аб'яднаць у радах камсамолу шырокія масы працоўнай моладзі, далі магчымасьць, асабліва ў апошні час, нязьмерна павялічыць разгортваньне дзейнасьці камсамолу і ідэйна загартаваць яе рады.

Гэта цалкам датычыць і камсамолу Савецкай Беларусі, які дзякуючы правільнаму і чуламу кіраўніцтву ЦК КП(б)Б у апошні час дабіўся вялікіх перамог на шматлікіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, на шматлікіх вучастках саюзнай работы. Новае кіраўніцтва ЦК ЛКСМБ змагло мабілізаваць саюз на вырашэньне чарговых гаспадарча-палітычных задач, прыняло поўныя крокі да разгортваньня перабудовы саюзнай работы і ідэйна-палітычнага выхаваньня мас камсамольцаў.

Вялікую работу камсамол Беларусі прарабіў у часе бальшавіцкай вясны, мабілізаваўшы камсамольцаў у МТС, у выніку чаго камсамол дапамог МТС па-баявому разгарнуць сяўбу і выканаць пасеўны плян. У часе ўборачнай кампаніі і асеньняй сяўбы асобныя камсамольскія арганізацыі паказалі сапраўды геройскія прыклады барацьбы. Усебеларускі камсамольскі абоз са збожжам, які даў таксама значныя вынікі, паказаў апэрацыйнасьць і канкрэтнасьць у кіраўніцтве ЦК ЛКСМБ. Цяпер па ініцыятыве камсамолу разгортваецца шырокая паласа зьлётаў герояў першай пяцігодкі, што суправаджаецца далейшым замацаваньнем удзелу камсамолу ў вытворчым жыцьці краіны і яшчэ больш узьнімае творчую актыўнасьць, ініцыятыву і прадукцыйнасьць працы мас камсамольцаў і ўсёй рабочай моладзі.

Моладзь на прадпрыемствах БССР, пад кіраўніцтвам партыйнай і камсамольскай арганізацый, займае выдатнае і адказнае месца ў выкананьні народна-гаспадарчых пляноў.

Але разам з тым на цэлым радзе вучасткаў камсамол Беларусі мае буйныя прарывы і недахопы. Аднак гэта ні ў якой ступені не дае права прыніжаць тыя зрухі і посьпехі, якія адбыліся ў апошні час у ЛКСМБ і адбыліся толькі дзякуючы партыйнаму кіраўніцтву, дзякуючы таму, што «ЦК партыі ўдалося ў значнай колькасьці раёнаў павярнуць раённае кіраўніцтва да пытаньняў партыйнага кіраўніцтва камсамолам» (**В. Жаброўскі,** з прамовы на VI пленуме ЦК ЛКСМБ).

У той-жа час трэба з усёй рашучасьцю падкрэсьліць, што партківараўніцтва нізавых партыйных зьвеньняў (парткомаў, партколектываў, ячэек і інш.) ва многіх мясцох усё яшчэ адстае ад растучых запатрабаваньняў камсамолу.

У цэлым радзе раёнаў замест сапраўднага, штодзеннага кіраўніцтва і чулай дапамогі камсамолу, ёсьць мноства фактаў адміністраваньня, дробнага апякунства, спажывецкага падыходу да камсамолу і г. д.

Падамо некалькі прыкладаў.

Віцебскі гарком КП(б)Б у свой час дапусьціў скажэньне дырэктыў ЦК аб партыйным кіраўніцтве камсамолам. Віцебскі гарком партыі на працягу доўгага часу ігнараваў камсамольскую арганізацыю. Ён бяз ведама гаркому камсамолу пачаў вырашаць камсамольскія пытаньні (аб рабоце піянерарганізацыі, аб вясковым камсамоле ды інш.), стаўшы на шлях ігнараваньня новага кіраўніцтва віцебскай камсамольскай арганізацыі. Адміністраваньне, дробязная апека, спажывецкі падыход да камсамолу падмянілі сапраўднае партківараўніцтва і ў цэлым радзе буйнейшых партколектываў віцебскай партарганізацыі. Такое становішча партыйнага кіраўніцтва не магло не адбіцца на рабоце камсамолу: цэлы рад мерапрыемстваў вялікага значэньня віцебскім камсамолам правалены.

Практыка адміністраваньня і ігнараваньня ГК ЛКСМБ дайшла да нізавых зьвеньняў віцебскай партарганізацыі і дала свае шкодныя вынікі. Бюро партколектыву фабрыкі **«Дзьвіна»** яшчэ 1 сакавіка заслухала даклад аб рабоце камсамольскага камітэту фабрыкі, які яднае 640 камсамольцаў. Была прынята фармальная бюракратычная пастанова: «Адзначыць, што за час абмену камсамольскіх білетаў ёсьць зрух у перабудове камсамольскай работы». І ўсё. Так спакойна, усхадненькава, шматбаковае жыцьцё, недахопы, непаразуменьні фабрычнай камсамоліі бюро партколектыву ўціснула ў мёртвы пратакольны пункт.

У Віцебску ня было пастаяннай работы з партпрымацаванымі. Больш таго, у многіх зьвеньнях камсамольскай арганізацыі такавыя зусім адсутнічаюць. Тыя таварышы, якія былі вылучаны партпрымацаванымі, у большасьці сваёй ніякай выхаваўчай работы ў камсамоле не вялі. Іх нізкі ідэйна-палітычны ўзровень і няведаньне спэцыфікі камсамольскай работы не дазвалялі забясьпечыць патрэбнае кіраўніцтва і дапамогу камсамолу.

Трэба адзначыць, што зараз, пасьля сыгналаў друку, віцебская партарганізацыя, паводле ўказаньняў ЦК КП(б)Б, стала на шлях выпраўленьня сваіх памылак, але гэта **не азначае,** што ўрокі Віцебску павінны застацца бяз увагі ўсіх партарганізацый.

У часе разгортваньня бульба і збожжазагатовак цэлы рад камсамольскіх арганізацый не аказаліся на вышыні задач гэтых баявых кампаній.

У гэтых адносінах характэрным прыкладам зьяўляецца становішча **Чавускай** раённай камсамольскай арганізацыі.

Кіраўніцтва Чавускага РК КСМ не арыентавала арганізацыю на сваячасовае выкананьне пляну загатовак, не мабілізавала мястэчковых арганізацый на дапамогу вясковым. Райком ЛКСМБ ня ведае ходу ўдзелу камсамольскай арганізацыі ў выкананьні гэтых важнейшых гаспадарча-палітычных задач, а гэта значыць, райком ня ведае сваёй арганізацыі.

Віна ў гэтым і партыйнага кіраўніцтва. Работнікі РК ЛКСМБ лічацца ў райкоме партыі, як нейкія «пасынкі». Ніводнага мерапрыемства, якое праводзіў камсамол, РК КП(б)Б не абгаварваў. Так здарылася і з загатоўкамі. Замест дапамогі, падтрыманьня і сваячасовага рашучага рэагаваньня на недахопы і праяўленьні кулацкай агентуры ў радах камсамольскай арганізацыі, Чавускі РК КП(б)Б выносіць рэзалюцыі, а практычных мерапрыемстваў ніякіх не прымае.

Гэтай «практыцы партківараўніцтва» мы можам процістаўляць штодзенныя клопаты, сапраўдную дапамогу і кіраўніцтва Магілеўскага гаркому партыі камсамольскай арганізацыі. Яшчэ ў дні кастрычніцкіх сьвят магілеўская камсамолія рапартавала ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ пра перавыкананьне пляну загатоўкі і адгрузкі бульбы пралетарам гораду Леніна.

Камсамол Магілеўшчыны пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі паказаў сябе вялікай арганізуючай сілай і адыграў вялізарнейшую ролю ў правядзеньні загатовак. Разгортваньне грамадзкага буксіру адстаючых, дапамога гарадзкога камсамольскага актыву вясковаму, «узнагароджваньне» адстаючых ячэек рагожнымі сьцягамі, шырокае разгортваньне палітмасавай работы і г. д.,—усё гэта прыклады таго, што магілеўская камсамолія з гонарам вытрымала экзамэн у часе бульбазагатовак.

VII канфэрэнцыя УсеЛКСМ адзначыла, што «цэнтральная задача камсамолу на сёньняшнім этапе яго разьвіцьця заключаецца ў павышэньні ідэйнага ўзроўню ўсёй выхаваўчай дзейнасьці саюзу, у павышэньні якасьці масава-палітычнай работы сярод беспартыйнай моладзі, марксыцка-ленінскай вучобы, для далейшага, яшчэ большага ўдзелу на ўсіх вучастках гаспадарчага і культурнага будаўніцтва».

Зусім зразумела, што гэтыя вялізарныя задачы ставяць перад партыйным кіраўніцтвам нізавых зьвеньняў больш павышаныя патрабаваньні ў адносінах кіраўніцтва і дапамогі камсамолу.

Тав. Гікало ў сваёй прамове на камсамольскай нарадзе, якая нядаўна адбылася, аналізуючы стан работы камсамолу, падкрэсьліў, што **«справа заключаецца ня ў тым, каб райком заслухаў, вынес пастанову і г. д., але ў тым, каб сыстэматычна, кожны дзень ён дапамагаў камсамолу вырашаць тыя ці іншыя пытаньні, аказваў дапамогу людзьмі і г. д. А гэтага бязумоўна яшчэ няма».**

Ва ўсёй сыстэме партыйнага кіраўніцтва камсамолам адыгрывае вялізарнейшае значэньне партыйнае ядро ў камсамоле. У гэтай галіне ў камсамоле Беларусі ёсьць значнае аслабленьне работы. Партпраслойка ў камсамоле, праз якую ў вялікай меры ажыцьцяўляецца партківараўніцтва, якая цэмантуе рады камсамолу, **зьніжаецца.** Калі ў 1930 г. у ЛКСМБ партпраслойка складала 20 проц., дык у 1931 г. гэты процант зьнізіўся да 16, а ў пачатку 1932 г.— да 13.

У той-жа час трэба адзначыць і аслабленьне тэмпаў росту партыі за лік камсамолу. У 1930 г. у партыю было перадана з камсамолу 3.300 чал., што складае 25 проц. агульнага прыёму; у 1931 г.—3.786, што складае 29 проц., у першым квартале 1932 г.—685, або 16 проц.

Перад камсамолам і партыйнымі арганізацыямі стаіць адказная задача—падрыхтоўка камсамольцаў у партыю і ўмацаваньне партыйнага ядра ў камсамоле.

У той-жа час трэба падкрэсьліць, што ў нізавых партзьвеньнях пытаньні работы партпрымацаваных знаходзяцца часта па-за ўвагай ячэек.

Партпрымацаваны павінен быць у кожнай ячэйцы ЛКСМБ. На неабходнасьці дасканалага падбору партпрымацаваных завастралася ўвага ў пастановах раду партыйных зьездаў (XI, XII, XIV) УсеКП(б). Задача партпрымацаванага, прымаючы актыўны ўдзел у рабоце камсамольскага кіраўніцтва,—перадаваць камсамолу вопыт, традыцыі партыі, дапамагаць камсамольскаму актыву аўладоўваць майстэрствам бальшавіцкага кіраўніцтва масамі моладзі.

Сёньняшняе становішча партківараўніцтва ў нізавых зьвеньнях патрабуе баявога выкананьня пастаноў партыі аб больш сыстэматычным абгаварэньні і пастаноўцы пытаньня камсамольскай работы на партыйных сходах. І асабліва гэта патрэбна зараз, калі роля камсамолу ўзрасла.

Выкананьне ўсіх гэтых мерапрыемстваў забясьпечыць бязумоўнае паляпшэньне становішча партківараўніцтва ва ўсіх зьвеньнях беларускага камсамолу, яшчэ больш узьніме ўдзельную вагу камсамолу ў будаўніцтве сацыялізму, яшчэ больш загартуе камсамол у працэсах жорсткай клясавай барацьбы за сацыялізм.

Юбілей Якуба Коласа

На бальшавіцкі троп

Бабулька ў паэме Якуба Коласа «Калгаснае» дрыжучым, паміраючым голасам кажа:

І што гэта будзе? ой што гэта будзе?..
Народ зьбіўся з тропу, зьбянтэжаны людзі.
Прапаў заработак, прапаў ён на векі,
Бо верыць ня будуць ні ў шэпты,
ні ў лекі!

Разьбіты старыя тропы, канчаткова закрэслены ў сьвядомасьці працоўнага народу. Паэт «беларускага працоўнага люду», акадэмік Якуб Колас, у сваёй багатай літаратурна-мастацкай творчасьці прайшоў шмат дарог. Збочвалі часам гэтыя дарогі ў нядобры бок, але Якуб Колас заўсёды знаходзіў сілы, каб выйсьці на правільны шлях і ў апошнія гады цьвёрда стаў і цяпер упэўнена крочыць **па нашым, бальшавіцкім тропу.**

І ў тэй-жа паэме «Калгаснае» маладая новая сіла — бальшавіцкая моладзь узьнімае словы як сьцяг:

І зямлю мы разгародзім,
Межы выкінем з палёў.
Жыць замкнута досыць, годзі!
Мы — імклівае разводзьдзе —
Загародкі ўсе далоў!

... 15-га сьнежня Савецкая Беларусь урачыста адзначала 50-годзьдзе з дня нараджэньня народнага паэта Якуба Коласа. У будынку дзяржаўнага тэатру сабраліся рабочыя, акадэмікі і прафэсары, пісьменьнікі і настаўнікі. На шырокім чырвоным палотнішчы, над сцэнай—**«ШЧЫРАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ ДАРАГОМУ ЮБІЛЯРУ ЯКУБУ КОЛАСУ».**

Урачысты вечар адкрыў наркамасьветы т. **Платун.** Свою ўступную прамову тав. Платун закончыў:

— Жадаем-жа нашаму дарагому юбіляру, народнаму паэце Савецкай Беларусі, тав. Якубу Коласу, яшчэ шмат гадоў працаваць на будаўніцтве культуры нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьместу!

Доўгімі гучнымі апладысмэнтамі заля сустрэла выбары юбіляра ў прэзыдыум. За сталом прэзыдыуму — прэзыдэнт БАН тав. **Горын,** акадэмік **Замоцін,** народны паэт **Янка Купала, т. т. Платун, Клімковіч, Мятла, Ракі-Міхайлоўскі,** пісьменьнікі **Чарот, Лынькоў, Галавач, Харык,** прадстаўнікі ад заводаў і чырвонаармейскіх часьцей.

З вялікім дакладам аб творчасьці юбіляра выступіў тав. **Бэндэ.**

Прэзыдэнт БАН тав. **Горын,** вітаючы юбіляра, расказаў аб тым вялікім творчым энтузіязьме, аб «юнацкім парыве» наперад, з якімі Якуб Колас працуе на адказьнейшым вучастку сацыялістычнага будаўніцтва — у Акадэміі Навук.

Янка Купала, 50-годзьдзе якога таксама сьвяткавалі мы ў верасьні месяцы г. г., прачытаў верш, прысьвечаны Якубу Коласу. Сяброўскі пацалунак двох народных паэтаў быў прычынай гучнай авацыі ўсёй залі.

Юбіляра віталі т. т. **Лынькоў,** яўрэйскі паэт **Харык, Мятла** і інш. Тав. **Мікалаеў** агаласіў прывітаньне юбіляру ад газэты **«Известия»,** аргкамітэтаў Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў **Украіны, РСФСР, Грузіі,** ад пісьменьніка **Бруно Ясенскага** і іншых арганізацый і таварышоў.

Адказная прамова **Якуба Коласа** была спаткана гучнымі працяжнымі воплескамі. Прысутныя, стоячы, паладзілі вялікую авацыю юбіляру.

У заключэньне юбілейнага вечару адбыўся канцэрт пераважна з твораў Якуба Коласа. Актёры БДТ-1 — **Глебаў, Ржэцкая, Галіна, Грыгоніс, Станюта, Платонаў, Ждановіч** з вялікім майстэрствам выканалі тэатралізаваную паэму **«Калгаснае»** і рад іншых новых вершаў юбіляра. У канцэрце таксама прынялі ўдзел яўрэйскі дзяржтэатр, рабочы беларускі хор, пад кіраўніцтвам тав. **Сэляха,** яўрэйскі вакальны ансамбль пад кіраўніцтвам **Палонскага,** тэатр опэры і балету

Д. Б.

Пра вызначэньне фондаў заработнай платы

Пастанова ЦКК-НК РСІ і НКПрацы БССР ад 17-XII 1932 г.

ЦКК-НК РСІ і НКПрацы БССР пастанаўляюць:

У выкананьне пастановы СНК СССР ад 3 сьнежня 1932 г. пра фонды зарплаты:

1. Абавязаць усе наркаматы, цэнтральныя ўстановы і арганізацыі да 22 сьнежня 1932 г. устанавіць па сваіх апаратах і па ўсіх падпарадкаваных ім гаспадарчых аб'яднаньнях і трэстах цьвёрдыя фонды зарплаты на 1933 г.

2. Фонды зарплаты па кожнай установе павінны ўстанаўляцца з разьліку дыфэрэнцыяваных сярэдніх ставак, зацьверджаных НКПрацы (мінімальных і максымальных), па кожнай пасадзе ў пагсобку — пасьля скарачэньня штатаў ЦКК-НК РСІ.

Ужываньне толькі максымальных ставак пры вылічэньні фондаў зарплаты катэгарычна забараняецца.

3. Да агульна вылічанага ў адпаведнасьці з п. 2 гэтай пастановы фонду зарплаты дадаць суму, складаючую розьніцу ў аплаце пэрсанальных ставак спэцыялістам, устаноўленым НКПрацы на працягу 1932 г. супроць сярэдніх акладаў, прадугледжаных схэмамі НКПБ на 1932 г.

4. Для ажыцьцяўленьня кантролю над правільным вызначэньнем фондаў зарплаты стварыць пры ЦКК-НК РСІ Бел. камісію ў складзе: т. т. КАСЬЦЮКОВІЧА (старшыня), ГОЛЬДЭНБЭРГА (НКПрацы), АДАМА (ЦСПСБ), ВАРОНІНА (НКФ) і МІКУЛЬСКАГА (Дзяржбанк).

5. Устаноўленыя на наркаматах, цэнтральных установах, гаспадарчых аб'яднаньнях і трэстах фонды зарплаты прадставіць не пазьней 23 сьнежня 1932 г. у НК РСІ Бел.

Работу па праверцы фондаў зарплаты камісіі скончыць не пазьней 26 сьнежня 1932 г.

СТАРШЫНЯ ЦКК КП(б)Б — НК РСІ БССР ЛЫЧОЎ.

ЧВА НАРКАМПРАЦЫ БССР КОНЬНІКАЎ.

Чаму замоўклі рэмінгтоны

Алё! Алё! Аддзел сувязі?.. Гэта з райкому. Хто ля тэлефону? Кіраўнік? Чаму няма людзей. Што-ж для цябе спэцыяльны загад будзе ці што?.. Што? Дзяжураць... Тэлеграф... Тэлефон... Плявваць. Сам падзяжурыш, ліха цябе ня возьме. Зараз-жа ўсіх дзяўчат аслабаніць і каб яны былі тут... Глядзі...

Праз гадзін тры ці нават і менш грузавы аўтамабіль, да адказу напоўнены жанчынамі ўперамешку з мужчынамі, ад'ехаў ад Расонскага райкому. Усё больш і больш набіраючы ход, машына адмярала дзесяткі кілёмэтраў у гадзіну па шляху Расоны — Клясьціцы.

—Вось дык дарога. Ну, ты-ж толькі паглядзі — зварачаецца да шофэра начальнік 2-га дарбудвучастку **Кобызеў,** час-ад-часу кідаючы ўважлівы погляд па дарогу, якая шырокай шэраватай істужкай адлюстроўвалася перад машынай і сваім працягам хавалася дзесьці ў далечы за небасхілам.

Ахутаная імглістым асеньнім туманам машына імчыцца ўсё ўперад і ўперад, пакідаючы за сабою на коўзкай гразкаватай дарозе сухія палосы.

— Гані... Балазе праезд дан.

Сёньня раён атрымаў перамогу на дарожным будаўніцтве. На працягу 5 год ён першы раз выканаў плян, скончыўшы пабудову па ўсіх трактах.

— А ведаеш, — ня можа супакоіцца **Кобызеў,** — справа з дзяўчатамі ледзь не сарвалася. Кіраўнік аддзелу сувязі не хацеў адпусьціць.

— Гані! — і машына, скалануўшыся ўсім корпусам, дала апошні ход і панеслася стралой уперад.

— Ну, і як-жа? — пытаецца шофэр.

— Што як-жа?

— Ды з дзяўчатамі?

— Бачыш-жа, едуць. Выручыў сакратар райкому. Спэцыяльны выдаў загад: «Аслабаніць для ўдзелу ў вечары ўсіх дзяўчат, якія працуюць у раённых установах». Атрымаўшы да загаду яшчэ распараджэньне па тэлефону, кіраўнік райаддзелу сувязі ня толькі дзяўчат, але нават і замужніх жанчын адпусьціў. Але якая розьніца. Толькі-б больш жанчын.

У той час, як машына, усё умацняючы ход, набліжалася да мястэчка **Клясьціца,** загадчык гаспадаркі дарбудвучастку, хвалюючыся, ужо абходзіў у некаторы раз накрытыя для ўрачыстай вячэры сталы.

— Здаецца, зроблена ўсё. — І ён яшчэ, мо ў дзесяты раз паспрабаваць «ярша», які ў дзесятках бутэлек быў расстаўлен на сталох. Застаўшыся вельмі задаволеным смакам «ярша» ён зноў пачаў абыходзіць сталы, пільна ўглядаючыся, ці непатрэбна яшчэ чаго падправіць, ці ўсё добра.

«Добра, вельмі добра, думае загадчык гаспадаркі. — Здаецца, будуць задаволены».

Але гэтыя думкі перапыніў шум пад'ехаўшай машыны. Не пасьпеў загадчык дабегчы да дзьвярэй, каб спаткаць гасьцей, як у памяшканьне віхрай уварваліся прыехаўшыя дзяўчаты на чале з начальнікам будвучастку **Кобызевым** і асабіста выбранымі раённымі работнікамі.

Усе былі зачараваны дасканаласьцю падрыхтоўкі да вячэры. Яна была праведзена бясспрэчна ўдала. Бутэлькі, расстаўленыя ў вялікай колькасьці на сталох, сваімі рознакалёрнымі пераліўамі, так і запрашалі гасьцей—адведаць таго, што ў іх хавалася. Закускі казыталі насы гасьцей і напаміналі ім сваім пахам, што госьці праехалі больш 2-х дзесяткаў кілёмэтраў і што час ужо закусіць.

Вячэра пачалася зараз-жа. На працягу вельмі кароткага часу бутэлькі некалькі раз «зьмянялі свой колер»: спачатку на жоўты, потым на сінявата-белы, потым на блакітны, ды зноў белы. Словам, колер бутэлек зьмяняўся да тэй пары, пакуль усе не набылі ружовы колер.

Вечар скончыўся, як пачало сьвітаць. Госьці з раёну паехалі дамоў значна пазьней. «Мабілізаваныя з раённых установ супрацоўніцы да працы прыступілі толькі праз дзень.

Ударнікі дарожнага будаўніцтва ўветары ўдзелу ня прымалі. Яны не атрымалі запрашальных білетаў. Прыкрываючыся цемнатою ночы і ахутаныя бляскім імжыстым туманам, яны пазіралі на вечар толькі знадворку, праз вокны.

Справа, аднак, бяз іх ня скончылася. Пасьля вечару яны вымушаны былі абвясьціць «штурм» для прывядзеньня ў належны выгляд памяшканьня, дзе адбываўся вечар.

Так «злыя языкі» перадаюць падрабязнасьці гісторыі «ўрачыстага» вечару. Магчыма было трохі інакш. Нам добра невядома. Ведома толькі тое, што ў гэты дзень шафы са справаводтвам раённых установ не адчыняліся. «Ундэрвуды» і «рэмінгтоны» маўчалі.

РКК-РСІ на ўсё гэта глядзела праз ружовыя акуляры.

А кіраўнік райаддзелу сувязі, круглыя суткі дзяжурыў на тэлеграфе. Ён, стомлены, як толькі заплюшчваў вочы, бачыў — стол, на ім закускі, цэлы строй бутэлек і шкляпак і каля іх завіхаўся райкомавец.

М. А. Рабцэвіч.

ПРАМАРЦЕЛІ БАБРУЙСКУ І РАГАЧОВА МАРУДНА ПЕРАБУДОЎВАЮЦЦА

Кіраваць канкрэтна, а не наогул

Скурраному трэсту БССР падпарадкуецца 5 прадпрыемстваў: гарбарня «Бальшавік», (Менск), імя Сталіна (Магілеў), віцебская гарбарня, аўчынна-футравы завод у Гомелі і магілеўскі сырамятны завод.

У адзнаку ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі і ўраду ў другой палове ліпеня гэтага году прадпрыемствы распачалі работу па скарыстаньні адкідаў вытворчасьці для вырабу прадукцыі шырокага ўжытку. На 4-х прадпрыемствах створаны уцільцэхі.

Асноўны асартымэнт прадукцыі уцільцэхаў: балеткі, дзіцячыя бацінкі, сандалі, загатоўкі, клеєныя падмёткі, складаныя ўзьдзечкі, рукавіцы, шапкі, целагрэйкі і нестандартныя кажушкі.

У скуртрэсьце вылучан спэцыяльны работнік, на якога ўсклядзена адказнасьць за становішча работы па шырспажыву.

За прашоўшы час рад прадпрыемстваў дасягнулі нядрэнных посьпехаў. Плян трэцяга кварталу віцебская гарбарня перавыканала на 69,6 проц., аўчынна-футравы завод (Гомель)—на 50,6 проц., гарбарня «Бальшавік»—на 6,3 проц. і імя Сталіна (Магілеў) — на 3 проц. Разам па трэсту плян трэцяга кварталу выканан на 139,3 проц.

На чацьверты квартал трэстам заплянавана выпусьціць прадукцыі шырокага ўжытку на суму 104.237 руб.

За першы месяц гэтага кварталу—кастрычнік месячны плян па трэсту перавыканан на 38,4 проц., за лістапад—на 21,8 проц.

Аднак, трэба з усёй рашучасьцю адзначыць, што прадпрыемствы, у тым ліку і Белскуртрэст, далёка ня поўнасьцю выкарыстоўваюць магчымасьці, якія ёсьць у наяўнасьці для разгортваньня вырабу тавараў шырокага ўжытку.

Магілеўскі сырамятны завод, як ні адно з прадпрыемстваў, падпарадкаваных Белскуртрэсту, мае надзвычай вялікую колькасьць сырцу (абрэзкі скуры і інш.) для вырабу прадметаў шырспажыву, але трэст чамусьці не палічыў патрэбным стварыць уцільцэх на гэтым заводзе, з прычыны чаго ўсе адкіды і да гэтага часу ідуць на звалку.

На прадпрыемствах вельмі мала ўвагі ад даецца пытаньню рацыяналізацыі вытворчых працэсаў ва уцільцэхах. У трэцім квартале трэстам праводзіўся месячнік па паляпшэньні работы уцільцэхаў, у часе якога на прадпрыемствах сабрана 96 рацыяналізатарскіх рабочых прапаноў. Абсалютная большасьць прапаноў і да сёньняшняга дня марынуецца ў папках рацыяналізатараў прадпрыемстваў.

Адказны за шырспажыў па трэсту тав. **Фрыдман** ня турбуецца, каб як мага хутчэй ажыцьцявіць паступіўшыя рацыяналізатарскія прапановы, што дало-б значны крок на перад да паляпшэньня вытворчых працэсаў у вырабе тавараў шырокага спажываньня.

На гаспадарчы разрахунак пераведзены толькі два уцільцэхі з агульнага ліку 4-х —гарбарня «Бальшавік» і Гомельскі аўчынна-футравы завод.

Барацьба за якасьць прадукцыі шырспажыву на многіх прадпрыемствах яшчэ зусім невыстарчальна ўвязваецца з барацьбой за колькасныя паказальнікі прамфінпляну. Уцільцэх гомельскага аўчынна-футравага заводу, напрыклад, выробляе зімовыя шапкі, якія нельга дапусьціць да спажыўца з прычыны іх дрэннай якасьці.

Па-за ўвагай Белскуртрэсту праходзіць работа на прадпрыемствах па ўкамплектаваньні уцільцэхаў рабочай сілай. У трэцім квартале, паводле пляну трэсту, ва уцільцэхах павінна было працаваць 64 чал. рабочых. Колькі-ж працуе фактычна—адказны за шырспажыў работнік трэсту тав. **Фрыдман** ня ведае. І гэта завецца кіраўніцтвам і адказнасьцю за важнейшы вучастак работы!

Ня лепшае становішча і з абсталяваньнем уцільцэхаў. На заводзе «Бальшавік» для бесьперабойнай работы уцільцэху патрэбны яшчэ дзьве машыны для строчкі загатовак і каля 30 пар шавецкіх капылоў. Але адказны трэсту за шырспажыў тав. Фрыдман не аказвае заводакіраўніцтву дапамогі, каб хутчэй набыць гэта абсталяваньне.

Не папяровае, а жывое канкрэтнае і аперацыйнае кіраўніцтва работай шырспажыву патрабуецца зараз ад Белскуртрэсту. Гэта трэба трэсту ўлічыць і перабудаваць работу ў бліжэйшыя дні.

М. Н-н.

Прэсы, выробленыя на Краматорскім заводзе «Сирена»

Палепшыць якасьць рамонту абутку

Бабруйская абутковая арцель «Прагрэс» працуе ў асноўным на шырспажыў. Рамантуе абутак, выробляе рэстаўрацыйныя боты, выконвае індывідуальныя заказы на пашыўку новага абутку.

Раней арцель выробляла з адкідаў балеткі, дзіцячы абутак і інш. Зараз выраб гэтых рачаў яна спыніла, матывуючы тым, што гомельская база скурснабзбыту не забясьпечыла арцелі сырцом (адкіды). Праўленьне-ж арцелі не паклапацілася высьветліць прычыны недагрузкі сырцу і ня выслала свайго прадстаўніка для выкананьня нараду.

Па майстэрнях самой арцелі, асабліва ў закройным цэху, ёсьць шмат розных адкідаў, якія можна скарыстаць для вырабу прадметаў шырспажыву, але яны не скарыстоўваюцца.

Для лепшага абслугоўваньня рабочых на больш буйных прадпрыемствах гораду арцель адкрыла 9 майстэрань для пачынкі абутку. Ініцыятыва, зразумела, добрая, але дрэнна тое, што ў сваёй далейшай рабоце праўленьне арцелі пра нова-адкрытыя майстэрні забылася. Майстэрні не ўкамплектаваны патрэбнай рабочай сілай.

Непаваротлівасьць праўленьня, рад унутрывытворчых непаладкаў адбіліся і на выкананьні праграмы. Вызначаны прамфінпляны у суме 200 тыс. руб. выканан толькі на 65 проц. Кастрычнік месяц даў некаторы зрух. Процант выкананьня ўзьняўся да 76. У лістападзе тэмпы работы рэзка зьніжаліся, двухдзёкадная заданьне выканана на 55 проц.

Няпраміьная арганізацыя вытворчых працэсаў, адсутнасьць сацспаборніцтва і ўдарніцтва, наяўнасьць прагулаў — галоўныя прычыны адставаньня. Члены арцелі Беляўскі і Бандарэўскі кожны месяц робяць па 3-5 дзён прагулу.

У арцелі ёсьць платны культработнік тав. Бэгельман, але культмасавая работа не праводзіцца.

Праўленьнем арцелі абсалютна ніякай увагі не аддаецца паляпшэньню якасьці рамонту абутку. Бываюць выпадкі, калі абутак знаходзіцца ў рамонце больш як 2 месяцы, а праз 4-5 дзён ён зноў патрабуе паўторнага рамонту.

Паляпшэньне снабжэньня членаў арцелі — забыты вучастак. Праўленьне на чале з **Нахмановічам** лічыць лішнім займацца гэтай справай. Была надзея, што работнікі майстэрань, якія працуюць пры прадпрыемствах, будуць забясьпечвацца з фондаў апошніх. Але ў выніку бязьдзейнасьці праўленьня арцелі работнікі адзначаных майстэрань доўгі час ні на прадпрыемствах, ні ў арцелі нічога не атрымалі.

Ліквідаваць адставаньне ў выкананьні прамфінпляну — баявая задача праўленьня арцелі. Для гэтага ёсьць усе магчымасьці.

А. Ф-ў.

Абслугоўваць калгасьнікаў ім „не да твару“

— З каваліаў, абрэзкаў,—расказвае стары член рагачоўскай швейнай арцелі «**Прагрэс**» тав. **Рыскін,**—робім зімовыя шапкі. Вярхі і падкладкі—усё робім з адкідаў. Кожны дзень наша брыгада дае 70 шт. шапак розных відаў: кубанкі, вушанкі, маласейкі і інш.

— У нас нічога ў глум ня ідзе,—заяўляе ад суседняга варштату 48-гадовы кравец **Хайкін.**—З маленькіх кавалкаў футра сібірскага коціка робім прыгожыя і добраякасныя каўняры, да таго-ж і не дарагія. Нашы абшлагі на польты каштуюць усяго 12 руб., а зроблены так, што цяжка адрозьніць—суцэльныя яны ці сшытыя. Зроблены мною такі экспанат для бабруйскай міжраённай выстаўкі заняў першае месца і наша арцель атрымала прэмію.

У арцелі працуе зараз 58 чал. Акрамя вырабу рэчаў з адкідаў, шыюцца польты, целагрэйкі і інш.

Але арцель далёка яшчэ не спраўляецца са сваімі задачамі. Прамфінплян трэцяга кварталу ў 52.674 руб. выканан толькі на 79,6 проц. У кастрычніку процант выкананьня зьнізіўся да 36 проц. Лістапад зруху таксама ня даў.

Ганебнае адставаньне тлумачыцца непаваротлівасьцю праўленьня на чале са старшынёй тав. **Рэйнгольдам.** Гора-кіраўнікі прывыклі спадзявацца на цэнтралізаванае снабжэньне сырцом і лічаць, што ім не да твару займацца абслугоўваньнем калгасьнікаў і выконваць работу з сырцу заказчыкаў. Толькі 12 чал. пераведзены на выраб рэчаў з матар'ялу заказчыкаў для абслугоўваньня гарадзкога насельніцтва. Калгасьнікі і працоўныя аднаасобнікі паранейшаму шыюць вопратку ў вясковых краўцоў і гарадзкіх саматужнікаў і плоцяць за гэта амаль больш як у тры разы, чым у арцелі.

Праўленьне не клапоціцца аб паляпшэньні бытавых умоў сваіх членаў. Арцель ня мае сталоўкі. Да іншых сталовак члены арцелі не прымацаваны.

Работа арцелі ідзе па старынцы. Няма разьмеркаваньня працы па апэрацыях. Гэта ў значнай ступені замаруджвае выраб прадукцыі і павышае яе сабекошт.

Задача арцелі—у бліжэйшыя дні выйсьці з глыбокага прарыву. Абавязак Бабруйскага міжраённага самрамсаюзу—дапамагчы арцелі ў наладжваньні работы.

Ф.

Канвэер зернячысьцілак на Гомсельмашы

Хацкевіч

Фінансавыя задачы 1933 году

(Да сэсіі ЦВК БССР)

Гэтымі днямі ЦВК БССР і СНК разглядзелі дзяржаўны бюджэт на 1933 год, агульны аб'ём якога спраектаваны ў суме 317.756 тыс. рублёў, што ў параўнаньні з бюджэтам гэтага году дае рост на 37,1 проц.

Шпаркі рост усяго народнага даходу і асабліва сацыялістычнага сэктару народнай гаспадаркі забясьпечылі буйныя посьпехі ў выкананьні фінансавай базы сацыялістычнага будаўніцтва першай пяцігодкі.

Асноўнымі і рашаючымі фінансавымі інстытутамі на працягу ўсёй пяцігодкі зьяўляліся дзяржаўны і мясцовы бюджэты. Праз гэтыя магутнейшыя вагары партыя і ўрад праводзілі барацьбу за ажыцьцяўленьне ўзятых тэмпаў на фронце гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, на фронце ператварэньня БССР з краіны запаншлай у перадавую індустрыяльна-аграрную краіну.

Фактычнае паступленьне даходаў за першую пяцігодку па дзяржбюджэце складае 687 млн. руб., супроць 663,3 млн. руб., прадугледжаных пяцігадовым плянам і па мясцовых бюджэтах адпаведна 472,3 млн. руб. супроць 392,1 млн. руб. **Плянавыя меркаваньні пяцігодкі па даходах выкананы за чатыры гады па дзяржбюджэце на 103,6 проц. і па мясцовых бюджэтах — на 120,4 проц.**

Даходы дзяржбюджэту на працягу чатырох год пяцігодкі павялічыліся амаль у два з паловаю разы, а мясцовых бюджэтаў амаль у тры разы. Адлічэньні ў дзяржбюджэт з даходаў прамысловасьці ўзрасьлі ў 1932 г. да 39,5 млн. руб. замест 4,2 млн. руб. па бюджэту 1928-29 году, г. зн. больш як у дзевяць раз. Удзельная вага бюджэтных даходаў ад аграмадзканай гаспадаркі ўжо ў 1932 годзе ўзрасла да 70,6 проц.

Ажыцьцяўляючы фінансаваньне важнейшых задач сацыялістычнага будаўніцтва, **расходная частка бюджэту пяцігодкі выканана таксама за чатыры гады па дзяржбюджэту на 103,2 проц. і па мясцовых бюджэтах на 113,6 проц.**

За гэты час на фінансаваньне народнай гаспадаркі накіравана па дзяржбюджэту 196,6 млн. руб. і па мясцовых— 118,7 млн. руб., а ўсяго 315,3 млн. руб., ці 37,2 проц. усіх бюджэтных расходаў.

Прамысловасьць па дзяржбюджэту атрымала 97,7 млн. руб. і па мясцовых бюджэтах 25 млн. руб. Гэта побач з ростам уласных накапленьняў значна павялічыла асноўныя фонды прамысловасьці, якія дасягнулі на 1 студзеня 1932 году па саюзнай і рэспубліканскай прамысловасьці 151,2 млн. руб. замест 57,1 млн. руб. на 1 кастрычніка 1928 году, у тым ліку па рэспубліканскай прамысловасьці адпаведна 98,2 млн. руб. замест 39,7 млн. руб.

На рэканструкцыю сельскай гаспадаркі праз бюджэты выдаткавана 95,3 млн. руб. Звыш 60 проц. гэтай сумы пайшло на саўгаснае будаўніцтва.

Выконваючы дырэктывы партыі і ўраду аб узмацненьні тэмпаў камунальнага і жыльлёвага будаўніцтва, на гэтыя патрэбы выдаткавана па дзяржаўным і мясцовым бюджэтах 56 млн. руб. ці на 44 проц. больш плянавых меркаваньняў.

Асабліва значнае месца ў бюджэтах займае сацыяльна-культурнае будаўніцтва. На гэтыя мерапрыемствы па дзяржбюджэту выдаткавана 152,2 млн. руб. і па мясцовых бюджэтах — 244,1 млн. руб., а разам 396,3 млн. руб., ці 46,7 проц. усіх бюджэтных расходаў. Па гэтых выдатках пяцігодка за чатыры гады перавыканана на 11 проц.

Бальшавіцкія перамогі на фінансавым фронце ў першай пяцігодцы зьявіліся магутным фактарам у справе пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі. Гэтыя перамогі дасягнуты ў выніку жорсткай барацьбы з праўленьнімі правага апартунізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва, і «лявацкімі» заскокамі ў фінансавай рабоце, у выніку змаганьня за ўкараненьне гаспадарчага разрахунку ва ўсе зьвеньні народнай гаспадаркі.

Толькі на аснове дасягненьняў першай пяцігодкі СНК і ЦВК БССР змаглі запраектаваць рост бюджэту на 37,1 проц. **Дзяржаўны бюджэт,** які ўносіцца на зацьверджаньне сэсіі ЦВК БССР выходзіць з неабходнасьці выкананьня пастаўленых XVII партыйнай канфэрэнцыяй задач на другую пяцігодку — пабудовы бяскласавага сацыялістычнага грамадзтва, «завяршэньня рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі, стварэньня навейшай тэхнічнай базы для ўсіх галін народнай гаспадаркі» і **«шпаркага росту сацыялістычнай гаспадаркі ў нацыянальных рэспубліках і абласьцях»** (з рэзалюцыі XVII канфэрэнцыі УсеКП(б) — вось стрыжань, які чырвонай істужкай праскае ўсе артыкулы разгледжанага бюджэту.

Пры агульным **росьце даходнай часткі** дзяржаўнага бюджэту да 317.675 тыс. руб. ці на 37,1 проц., уласныя даходы павялічваюцца на 28,3 проц. супроць 1932 г., складаючы суму у 297.19? тыс. руб.

Выключна рашаючае і ўсё ўзрастаючае значэньне ў даходах бюджэту займаюць паступленьні ад аграмаджанай гаспадаркі. Удзельная вага гэтых даходаў дасягае 75,4 проц. замест 70,6 проц. у бягучым годзе, у тым ліку падатак са звароту 58,1 проц. Агульная сума адлічэньняў у бюджэт па падатку са звароту разам з бюджэтнымі нацэнкамі павялічылася на 52,4 проц. супроць бягучага году, дасягнуўшы 172.500 тыс. руб.

Ня меншае значэньне адыгрываюць і прыбыткі гаспадарчых арганізацый, адлічэньні ў бюджэт ад якіх запраектаваны ў суме 42.495 тыс. руб. У параўнаньні з іншымі бюджэтнымі даходамі адлічэньні ад прыбыткаў даюць значна меншы рост — 0,6 проц. супроць 1932 году.

Рост агульнай сумы накапленьняў па рэспубліканскай прамысловасьці ў 1933 годзе мяркуецца наступны: па цяжкай прамысловасьці з 5.800 тыс. руб. да 7.250 тыс. руб. ці на 25 проц.; па лёгкай прамысловасьці з 35.450 тыс. руб. да 44.955 тыс. руб ці на 26,8 проц. і па харчовай — з 14.357 тыс. руб. да 18.105 тыс. руб. ці на 26,1 проц. Разам па прамысловасьці гэты рост выяўляецца з 55.607 тыс. руб. да 73.310 тыс. руб., ці на 26.4 проц.

Гэта праграма накапленьняў запраектавана, выходзячы з росту валавой прадукцыі па ўсёй рэспубліканскай прамысловасьці на 27,9 проц., павялічэньня прадукцыйнасьці працы на 16,7 проц. і зьніжэньня сабекошту прадукцыі на 3,4 проц.

Значнае месца ў фінпляне 1933 году займаюць сродкі насельніцтва. Іх удзельная вага ў даходах толькі дзяржаўнага бюджэту складае 23,7 проц. З агульнага пляну мабілізацыі сродкаў 1933 году ў суме 264.280 тыс. руб. праз дзяржаўны бюджэт акумулюецца 70.550 тыс. руб., што параўнальна з 1932 годам дае рост на 30,5 проц.

Плян мабілізацыі сродкаў насельніцтва спраектаваны, выходзячы з дынамікі грашовых даходаў паасобных груп насельніцтва, стабілізацыі фактычнага аб'ёму плацяжоў пралетарыяту і павялічэньня плацяжоў вёскі ў адпаведнасьці са значным ростам усіх даходаў сельскага насельніцтва.

Выкананьне вызначанай праграмы мабілізацыі сродкаў, зразумела, патрабуе далейшага ўздыму палітычна-масавай работы, узьняцьця справы выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў на ўзровень важнейшых гаспадарча-палітычных задач.

Расходная частка дзяржаўнага бюджэту цалкам падпарадкавана далейшай індустрыялізацыі і ператварэньню Беларусі ў перадавую індустрыяльна-аграрную краіну, задачам далейшай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі на базе яе машынізацыі і арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Таму бюджэт прадугледжвае павялічэньне асыгнаваньняў на фінансаваньне народнай гаспадаркі з 66.348 тыс. руб. у бягучым годзе да 70.806 тыс. руб.

Фінансаваньне прамысловасьці ўзрастае на 33,1 проц. супроць бягучага году. Прычым дзяржаўны бюджэт фінансуе толькі тыя затраты ў асноўныя фонды і на папаўненьне зваротных сродкаў, якія не пакрываюцца ўласнымі накапленьнямі гаспадарчых арганізацый.

Па бюджэту на 1933 год сума расходаў на фінансаваньне сельскай гаспадаркі вызначаецца ў 24.352 тыс. руб. Калі прыняць пад увагу, па-першае, што фінансаваньне на сентрэсту пераходзіць на агульнасаюзны бюджэт, па-другое, вялізарнейшы рост уласных даходаў сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі і, нарэшце, узятая ўстаноўка на поўнае асваеньне затрат, зробленых на капіталаўкладаньне ў сельскую гаспадарку за мінулыя гады, прызначаная сума па бюджэту зьяўляецца даволі вялікай.

З агульнай сумы на фінансаваньне сельскай гаспадаркі, на саўгаснае будаўніцтва прыпадае 15.104 тыс. руб., або 62 проц., на дзяржаўныя мерапрыемствы 4.947 тыс. руб., або 20,7 проц. агульнай сумы, якая вызначаецца для сельскай гаспадаркі.

Расходы па бюджэту на **сацыяльна-культурныя мерапрыемствы** ўзрастаюць на 70,5 проц. і складаюць суму 98.935 тыс. руб., замест 58.015 тыс. руб. у бягучым годзе. Асабліва гэты рост выяўляецца па лініі асьветы і падрыхтоўкі кадраў.

На народную гаспадарку і сацыяльна-культурныя мерапрыемствы па бюджэту 1933 году накіроўваецца 169.741 тыс. руб. ці 53,4 проц. усіх расходаў дзяржаўнага бюджэту і 88,7 проц. расходаў па бюджэту бяз сродкаў, якія перадаюцца мясцовым бюджэтам.

Удзельная вага расходаў на кіраўніцтву зьмяншаецца з 2 проц. у бягучым годзе, да 1,7 проц. у 1933 годзе.

Ажыцьцяўленьне адказных задач, якія настаўлены перад мясцовай гаспадаркай, асабліва ў частцы паскарэньня тэмпаў камунальна-жыльлёвага будаўніцтва і забесьпячэньня намечаных па пляну сацыяльна-культурных мерапрыемстваў, а таксама рашучае ўмацненьне фінансавай базы мясцовых саветаў выклікала неабходнасьць павялічэньня сумы сродкаў, якія перадаюцца мясцовым бюджэтам да 126.425 тыс. руб. ці на 36,9 проц. больш, чым у бягучым годзе. Гэта сума, побач з ростам уласных даходаў, забясьпечвае рост мясцовага бюджэту 1933 году да 225.125 тыс. руб. замест 165.900 тыс. руб. у бягучым годзе, ці больш на 35,7 проц.

Дзяржаўны бюджэт пакрывае значную частку затрат у асноўныя фонды гаспадаркі, 32,9 проц. усіх расходаў па бюджэту прызначаецца на фінансаваньне капітальнага будаўніцтва народнай гаспадаркі і сацыяльна-культурных мерапрыемстваў.

Агульная сума расходаў на капітальнае будаўніцтва па рэспубліканскай і мясцовай гаспадарцы павялічваецца з 188 млн. руб. у бягучым годзе да 260 млн. руб. у 1933 г. у тым ліку па дзяржбюджэту з 49,1 млн. руб. да 62,9 млн. руб. На капітальнае будаўніцтва прамысловасьці па фінпляну 1933 году мяркуецца накіраваць 59,2 млн. руб. супроць 44 млн. руб. у бягучым годзе і на фінансаваньне сельскай гаспадаркі — 58,8 млн. руб. замест 38,5 млн. руб., прызначаных на 1932 год.

Цэнтральнай гаспадарча-фінансавай задачай 1933 г. зьяўляецца канцэнтрацыя ўсіх фінансавых і матар'яльных рэсурсаў на скапчэньне ў першую чаргу распачатага будаўніцтва ў папярэднія гады і будаўніцтва вызначаных плянам важнейшых аб'ектаў.

Ажыцьцяўленьне ўсіх пастаўленых перад дзяржбюджэтам задач карэнным чынам зьвязана з пасьпяховым выкананьнем вытворчых праграм па ўсіх зьвеньнях народнай гаспадаркі. Неабходна яшчэ больш разгарнуць барацьбу за безумоўнае выкананьне дырэктыў партыі аб пашырэньні крыніц і ўзмацненьні тэмпаў накапленьняў у сацыялістычным сэктары народнай гаспадаркі на аснове далейшага ўкараненьня гаспадарчага разрахунку, за бесьперабойнае выкананьне фінансавага пляну па ўсіх яго частках, за правядзеньне бальшавіцкай барацьбы за рэжым эканоміі, за мэтавае і эфэктыўнае скарыстаньне дзяржаўных сродкаў і за сапраўднае ажыцьцяўленьне кантролю рублём па ўсіх вучастках гаспадаркі і будаўніцтва.

«Неабходна, значыцца, пашукаць новыя крыніцы вакапленьня і ўзмацніць старыя, калі мы сапраўды хочам захаваць і разьвіць бальшавіцкія тэмпы індустрыялізацыі» **(Сталін).**

Гэтыя ўказаньні правадыра партыі і рабочае клясы тав. **Сталіна** павінны быць у наступным годзе асноўнай лініяй бальшавіцкага выкананьня задач на фінансавым фронце, на фронце будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне.

ПРАГРАМНАЯ ПРАМОВА ШЛЕЙХЭРА

Пагрозы па адрасе кампартыі

БЭРЛІН, 16. Уласны карэспандэнт «Праўды» Лорэнц піша: «Гаспадарчая праграма ўраду Шлейхэра адказвае патрабаваньням Эрупа, высунутым на нарадзе агульна-германскага саюзу прамыслоўцаў. Захоўваючы ў аснове папэнаўскую праграму «ажыўленьня» гаспадаркі, урад разам з тым, адмаўляецца ад усякіх валютных і палітычных экспэрымэнтаў, а таксама і ад аўтаркіі (кіраўніцтва краінаю без парлямэнта).

З другога боку, каб забясьпечыць інтарэсы аграрнага капіталу, урад абяцае яшчэ да каляд павялічыць мыты на прадукты сельскай гаспадаркі, якія ўвозяцца з-за мяжы. Значная частка прамовы была прысьвечана манэўрам, разьлічаным на ашуканства мас. Канцлер ня прызнае розьніцы паміж капіталізмам і сацыялізмам. Шлейхэр заявіў, што ён ганарыцца тым, што яго называюць «сацыяльным генэралам». Падкрэсьліваючы «сацыяльны дух» арміі, Шлейхэр заклікаў усе пласты насельніцтва да супрацоўніцтва. Ён асабліва падкрэсьліваў зробленую ім адмену надзвычайнага дэкрэту Папэна аб скарачэньні зарплаты і заявіў, што зьяўляецца прыхільнікам захаваньня сацыяльнага заканадаўства.

Гэтыя часткі прамовы яўна былі разьлічаны на тое, каб стварыць аснову для палітыкі падтрыманьня ўраду, якая зараз праводзіцца нацыянал-сацыялістамі і рэфармісцкімі прафсаюзамі. Аднак, у практычных пытаньнях, як напрыклад, у пытаньні прадастаўленьня зімовай дапамогі беспрацоўным «сацыяльны» генэрал аказаўся надзвычай няўступлівым і ў гэтых адносінах ён не пайшоў далей Папэна. Шлейхэр рэзка выступіў супроць пастаноў бюджэтнай камісіі аб скасаваньні надзвычайнага дэкрэту Папэна аб зьніжэньні дапамог беспрацоўным, інвалідам вайны і г. д. Умоцнена падкрэсьліваючы свае варожыя адносіны да ўсякіх экспэрымэнтаў над канстытуцыяй, Шлейхэр зазначыў неабходнасьць стварэньня шырокай масавай апоры для фашысцкай дыктатуры. Ён дамагаўся, каб рэйхстаг падтрымліваў урад. Рэйхстаг не павінен «умешвацца» ў работу ўраду і павінен адмовіцца ад «добра вядомых парляманцкіх мэтадаў».

Па адрасе камуністычнага руху Шлейхэр выступіў з моцнымі пагрозамі ў стылі Папэна. Ён адкрыта заявіў, што аб'яднаньне ў аднэй асобе пасад рэйхсканцлера і ваеннага міністра мела на мэце падкрэсьліць усю сур'ёзнасьць становішча і што гэта зроблена для ўзмацненьня націску на рэвалюцыйны рух. Закранаючы непасрэдна кампартыю, Шлейхэр пагражаў тым, што ўжо падрыхтаваны дэкрэт аб канчатковым задушэньні камуністычнага руху і што гэты дэкрэт у любы момант можа быць ажыцьцёўлены.

Далей ён заявіў, што ў выпадку неабходнасьці будуць выданы драконаўскія выключныя законы супроць кампартыі і будзе мабілізаван рэйхсвэр для барацьбы з камунізмам. Гэтыя пагрозы супроць рэвалюцыйнага руху неабходна паставіць у сувязь з імкненьнем Шлейхэра заручыцца падтрыманьнем нацыянал - сацыялістаў і прафсаюзаў і стварыць для ўраду шырокую масавую апору. Шлейхэр хоча адразу дабіцца дзьвюх мэтаў: прыцягнуць нацыянал-сацыялістаў і прафсаюзныя масы да падтрыманьня фашысцкай дыктатуры і зьнішчыць камуністычную небясьпеку шляхам задушэньня ўсіх рэвалюцыйных арганізацый.

Перапоўшы да пытаньня аб Прусіі, Шлейхэр заявіў, што пасада ўрадавага камісара можа быць ліквідавана толькі ў тым выпадку, калі будзе забясьпечана згоднае кіраўніцтва ў агульна-германскім і прускім маштабе. Ён, такім чынам, даў зразумець нацыянал-сацыялістам, што калі яны ня возьмуць на сябе адказнасьць і за агульна-германскую палітыку, дык ня можа быць і гутаркі аб тым, каб яны маглі разам з партыяй цэнтру сфармаваць прускі ўрад.

Пытаньні замежнай палітыкі Шлейхэр закрануў толькі мімаходам. Прызнаўшы заслугі Брунінга і Папэна, Шлейхэр указаў на посьпехі нібы дасягнуты Папэнам у Лёзане. Жэнэўскі кампраміс у пытаньні роўнапраўя Германіі Шлейхэр назваў «буйным крокам наперад». Замежна-палітычная частка прамовы канцлера была стрыманай.

АНГЛА-ПЭРСЫДЗКІ КАНФЛІКТ

ЛЕНДАН, 14. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр паведамляе: «Адказваючы ў палаце вобшчын на пытаньне аб англа-пэрсыдзкім нафтавым канфлікце, таварыш міністра замежных спраў Ідэн сказаў, што ў сувязі з намерам пэрсыдзкага ўраду апэляваць да рады Лігі нацый, што дало-б пэрсыдзкаму ўраду права патрабаваць адмены разгляду справы ў Гаагскім міжнародным трыбунале, брытанскі ўрад парашыў адмовіцца ад свайго патрабаваньня аб перадачы справы на разгляд Гаагскага трыбуналу і замест гэтага перадаць справу радзе Лігі нацый на падставе арт. 15 статуту Лігі. Адпаведная тэлеграма паслана Генэральнаму сакратару Лігі нацый з прапановай перадаць пытаньне радзе на падставе ўказанага артыкулу».

**

ЖЭНЭВА. Ангельскі ўрад зьвярнуўся да генэральнага сакратара Лігі нацый Дрэмонда з прапановай тэрмінова паставіць на абмеркаваньне Рады Лігі ў парадку 15-га артыкулу статуту Лігі канфлікт, узьнікшы ў рэзультаце ануляваньня пэрсыдзкім урадам канцэсіі «Англо-Першыян Ойль Ко». Як мяркуюць, рада Лігі зьбярэцца 20 або 21 сьнежня.

Заява Кадмана

ВЕНА. У «Нэйе Цурыхэ цэйтунг» (ад 9 сьнежня) зьмешчана тэлеграма амэрыканскага агенцтва «Юнайтэд прэс», адпраўленая з борту параходу «Эўропа». У гэтай тэлеграме гаворыцца:

«Старшыня англа-пэрсыдзкай нафтавай кампаніі Кадман, які знаходзіцца на борце параходу «Эўропа», што накіроўваецца ў Эўропу, меў гутарку з галоўным карэспандэнтам бэрлінскага аддзяленьня «Юнайтэд прэс» аб ануляваньні пэрсыдзкім урадам канцэсіі англа-пэрсідзкай кампаніі. Кадман заявіў, што ён спадзяецца на прыязнае ўрэгуляваньне канфлікту. З поваду чутак, быццам-бы Расія прымае ўдзел у гэтай гульні, Кадман заявіў, што ён ня можа паверыць у тое, што Пэрсія дзейнічала па ініцыятыве Расіі».

Нарада паміж камандуючымі брытанскімі морскім і паветраным флётамі

ЛЕНДАН, 16. Як паведамляе «Дэйлі мэйль», камандуючы брытанскімі паветранымі сіламі ў Басра (Ірак) меў нараду з камандуючым брытанскімі морскімі сіламі, што знаходзяцца ў Пэрсыдзкай затоцы. Набытыя нядаўна ў Італіі 6 пэрсыдзкіх кананерак, — піша далей газэта, — ня могуць перасоўвацца з прычыны таго, што англа-пэрсыдзкая кампанія адмаўляецца адпускаць ім нафту.

Абвастрэньне італа-югаслаўскіх адносін

РЫМ. 13 і 14 сьнежня ў Рыме адбыліся дэманстрацыі фашысцкай партыі і арганізацый фашысцкай моладзі і студэнтаў супроць Югаславіі. Поводам да гэтай дэманстрацыі паслужыла зруйнаваньне італьянскіх помнікаў у югаслаўскім горадзе Трау. З лёзунгамі «Няхай жыве італьянская Далмацыя» і сьцягамі Далмацыі, з жалобнымі істужкамі, дэманстранты прайшлі па гораду да палацу ўраду. Мусаліні вышаў на балькон і сказаў прамову, у якой далучыўся да «пачуцьцяў дэманстрантаў».

Дэманстрацыі супроць Югаславіі адбыліся таксама ў Падуі, Неаполі, Трыесьце, Брындызі і інш. гарадох Італіі.

Мусаліні ў сваёй прамове ў сэнаце паміж іншым заявіў, што «харваты не адказны за гэтыя дзеяньні».

Разьвіваючы заявы Мусаліні ў сэнаце, італьянскі друк адкрыта выказвае сымпатыі да харвацкага сэпаратысцкага руху.

Заява Мусаліні

Агенцтва Стэфані паведамляе:

«У спрэчках па інтэрпэляцыях адносна антыітальянскіх інцыдэнтаў у Далмацыі (Югаславія) у сэнаце выступіў Мусаліні і заявіў, што «падзеі, якія мелі месца ў Трау і Велья, павінны быць ацэнены, як сымптомы ўзмацненьня варожасьці ў адносінах Італіі. Зруйнаваньне помнікаў у Трау, акты гвалту супроць італьянцаў у Велья, у рэзультаце якіх забіт адзін італьянец, а таксама ўціск італьянцаў у Югаславіі выцякаюць з асноўных мэтаў, якія дастасоўваюцца суседняй дзяржавай. Усё гэта не работа адзельных асоб, або груп, а адпавядае дакладнаму пляну. Сапраўды адказных за гэтыя дзеяньні трэба шукаць у поўных колах нашай суседняй дзяржавы, якія вядуць варожую прапаганду і паклёпнічаюць супроць Італіі з тым, каб устанавіць роўнавагу ўнутры Югаславіі і ўжыць дывэрсійныя дзеяньні ў адносінах заграніцы. Аднак, ня менш адказны і іншыя элемэнты, якіх я назаву эўрапэйцамі. Гэтыя элемэнты дарэмна спадзяюцца вывесьці нас са стану спакою, узьнімаючы шалёную антыітальянскую кампанію цкаваньня ў прэсе, дзе недарэчнасьць меркаваньняў зусім адпавядае глупствам у заключэньнях».

Мусаліні паведаміў далей аб дэмаршэ італьянскага дыплёматычнага прадстаўніка ў Белградзе.

Выступленьне тав. Майскага на вечары таварыства культурнай сувязі паміж СССР і Англіяй

ЛЕНДАН, 16. Таварыства культурнай сувязі паміж Англіяй і СССР наладзіла прыём, на якім прысутнічала 300 прадстаўнікоў ад палітычных, эканамічных, навуковых, літаратурных і грамадзкіх колаў Лёндану. На гэтым прыёме савецкі паўпрад Майскі сказаў прамову наступнага зьместу:

— Наперакор усім фантастычным байкам аб так званым «чырвоным імпэрыялізме», наперакор усёй варожай прапагандзе, якая малюе «мрачные замыслы» савецкай дыплёматыі, — заявіў тав. Майскі, — фактам застаецца, што на працягу 12 год ад часу сканчэньня грамадзянскай вайны і інтэрвэнцыі, Савецкі саюз захоўваў мір, бязупынна працаваў для справы міру. Варожыя сілы прагрэсу і прыязьні паміж народамі прабуюць спэкуляваць на эканамічнай і палітычнай розьніцы паміж Англіяй і СССР, каб паставіць вялікую сьцяну ўзаемнага пераразуменьня і падазронасьці паміж народамі СССР і Брытаніі. На працягу 15 год гэтыя сілы вялі кампанію сьвядомага скажэньня савецкай сапраўднасьці. Формы і мэтады гэтай кампаніі зьмяняюцца, але сутнасьць яе застаецца аднэй і тэй-жа самай. Гэтыя выдумкі, хлусьня, або камбінацыі ілжы — усё скарыстоўваецца, каб нанесьці шкоду СССР. Такое становішча рэчаў зьяўляецца [illegible] небясьпекай для справы міру. Я думаю, што адным з лепшых мэтадаў барацьбы супроць гэтай небясьпекі зьяўляецца разьвіцьцё культурных адносін паміж нашымі абедзьвюма краінамі. Важнейшай задачай таварыства культурнай сувязі зьяўляецца пашырэньне ў Англіі «ісьціны, поўнай ісьціны і нічога апрача ісьціны» аб СССР.

УЗНАГАРОДА ТАВ. ЕНУКІДЗЭ ОРДЭНАМ ЛЕНІНА

МАСКВА. 17 сьнежня на пасяджэньні прэзыдыуму ЦВК СССР т. **Калінін** унёс прапанову ад імя ЦК УсеКП(б) і камфракцыі прэзыдыуму ЦВК аб **узнагародзе т. Енукідзэ ордэнам Леніна** за яго вялізарную і шматгадовую работу па савецкім будаўніцтве і арганізацыйным аб'яднаньні народаў Савецкага саюзу.

Пад бурныя аплёдысмэнты прэзыдыум ЦВК аднагалосна пастанавіў: «Адзначаючы выключныя заслугі т. Енукідзэ А. С., у справе стварэньня Саюзу Савецкіх Сацыялістычных рэспублік, яго бязупынную 10-гадовую дзейнасьць па арганізацыі брацкага супрацоўніцтва саюзных рэспублік і па ўмацаваньні роўнасьці ўсіх народаў СССР, — **узнагародзіць т. Енукідзэ А. С. ордэнам Леніна**».

Адказваючы на пастанову прэзыдыуму ЦВК, тав. Енукідзэ зазначыў, што гэту ўзнагароду ён прымае, як узнагароду ўсім работнікам па савецкім і нацыянальным будаўніцтве, якія сваёй работай садзейнічалі ўмацаваньню СССР і брацтву ўсіх насяляючых яго народаў.

Узнагарода дзеячоў па дасьледваньні Арктыкі

МАСКВА. Прэзыдыум ЦВК СССР пастанавіў за выключныя заслугі ў справе дасьледваньня Паўночнай Зямлі ўзнагародзіць **ордэнам Леніна начальніка экспэдыцыі на Паўночную Зямлю т. Ушакова** і інжынэра-біолёга **Урванцава**, а таксама ордэнам працоўнага сьцягу радыста **Ходова** і паляўнічага **Жураўлёва**.

За выдатныя заслугі, праяўленыя ў гераічным паходзе ледаколу «Сибиряков» праз Ледавіты акіян у адну навігацыю, прэзыдыум ЦВК СССР пастанавіў узнагародзіць **ордэнам чырвонага сьцягу ледакол «Сибиряков» і ордэнам працоўнага чырвонага сьцягу каманду ледаколу і 25 іншых удзельнікаў гэтай экспэдыцыі.**

На пасяджэньні прэзыдыуму ЦВК СССР 17 сьнежня кіраўніку навуковай часткі экспэдыцыі па ледаколе «Сибиряков» — **праф. Візэ былі перададзены ордэн працоўнага чырвонага сьцягу** за самаахвярную работу ў якасьці начальніка палярнай экспэдыцыі на ледаколе «Малыгін» у 1928 г. і **ордэн Леніна** — за пастаянную энэргію ў галіне навуковага дасьледваньня Арктыкі ў якасьці начальніка навуковай часткі экспэдыцыі на ледаколе «Сибиряков» у 1932 г.

Ордэн **«Красной звезды» атрымалі: інжынэр-лётнік Пятроў І. Ф., лётнік Цагі — Громаў і борт-мэханік «Цагі» — Васін.**

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Рэканструкцыя панчошна-трыкатажнай прамысловасьці Беларусі

Наркаматам лёгкай прамысловасьці БССР асыгнуецца 5,5 млн. рублёў на рэканструкцыю панчошна-трыкатажнай прамысловасьці Беларусі.

На фабрыцы імя КІМ у Віцебску ў 1933 годзе пачнецца ўстаноўка і мантаж 770 складаных аўтаматаў для вырабу панчох і шкарпэтак і 473 спэцыяльных аўтаматаў для вырабу дзіцячых панчох.

У сувязі з пашырэньнем фабрыкі выпуск розных панчох у 1933 годзе павялічыцца да 34.280 тыс. пар, замест 25 млн. у 1932 годзе.

Панчошная фабрыка імя Клары Цэткін у Віцебску рэканструюецца ў трыкатажную. Запраектавана пабудова раду новых цэхаў з устаноўкай упяршыню ў БССР 350 варштатаў сыстэмы «Томкінса» для вырабу трыкатажнай бялізны. У 1933 годзе фабрыка дасьць каля 500 тыс. пар трыкатажнай бялізны.

Ужо распачата работа па падрыхтоўцы кадраў для трыкатажнай фабрыкі імя Клары Цэткін. Для аўладаньня тэхнікай трыкатажных машын з панчошнай фабрыкі накіраваны ў Маскву брыгады з лепшых ударнікаў і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу. Фабзавуч пашырае набор вучняў да 680 чалавек. Для паляпшэньня матар'яльнага становішча вучні прыроўніваюцца па снабжэньні да рабочых фабрыкі і абслугоўваюцца закрытай рабочай сталоўкай.

Юбілей Клімавіцкай філіі саюзу савецкіх пісьменьнікаў

10 сьнежня грамадзкасьць Клімаўшчыны адзначыла гадавіну са дня арганізацыі клімавіцкай філіі саюзу савецкіх пісьменьнікаў.

Пад кіраўніцтвам райпартарганізацыі філія за гэты час дабілася значных посьпехаў у разгортваньні літаратурнага руху. На прадпрыемствах, па саўгасах, калгасах і навучальных установах Клімаўшчыны налічваецца 15 літаратурных гурткоў. Творчы актыў пачынаючых пісьменьнікаў, галоўным чынам, рабселькораў-ударнікаў — складаецца з 100—150 чалавек.

Філія ў дзень свайго юбілея атрымала прывітаньні ад райкому партыі, райпрафсавету і рэдакцыі «Камуна».

Сельгасмашын на 11.370 тыс. руб.

У 1933 годзе прадпрыемствамі с.-г. машынабудаўніцтва БССР будзе выпушчана с.-г. машын на 11.370 тыс. руб.

Гомсельмашам запраектаваны выпуск 4.000 сячкарань «Інтэрнацыянал», 1.000 сячкарань «Галіэф», 1.000 капуснасартовак, 1.000 бульбамыек і інш.

Завод «Чырвоны мэталіст» выпусьціць 4.000 балотных аднакорпусных плугоў, 500 жмыхадрабілак, 4.000 корнярэзак і значную колькасьць іншых машын.

Асваеньне новых машын у 1933 г.

Заводамі Белмэталаб'яднаньня ў 1933 г. будзе наладжан выраб 40-міліметравых сьвідравальных варштатаў, шчотачных аўтаматаў, цэглаапрацоўчых агрэгатаў, варштатаў па брыкітаваньні лясных адыходаў і рад інш. складаных машын.

Разьведваюцца месцанараджэньні жалезных руд у БССР

Белгеаразьведкай у гэтым годзе выяўлен рад месцанараджэньняў жалезных руд з запасам звыш 2 млн. тон. Гэтымі месцамі зьяўляюцца: каля лініі чыгункі — Мазыр — Аўруць, Мазыр — Маляраўка, па верхняй плыні Сож і па рэках Бярэзіна і Прыпяць. У 1933 годзе намечана разьведаць усё Палесьсе, паўночную частку Менскага, Лагойскага, Бабруйскага і раду інш. раёнаў.

Па даных Белгеаразьведкі, у гэтых раёнах ёсьць значныя паклады жалезных руд.

Хроніка

* Перавыбарчая кампанія ячэек Азэт праводзіцца Меназэтам з 13 сьнежня па 14 студзеня 1933 году ў Менску. Перавыбарамі будзе ахоплена 150 ячэек. Да гэтага часу Меназэтам рэалізавана білетаў азэтлётарэі на суму 30.000 руб.

* 5.600 трактарыстаў будуць падрыхтаваны на курсах пры 65 МТС у першым квартале 1933 году.

* Першы мэханізаваны паштамт пры Віцебскім вакзале будзе закончан у першым квартале 1933 году.

* На папяровай фабрыцы «Чырвоная зорка» ў Чашніках канчаецца будаўніцтва цэху для выпрацоўкі толі. Цэх будзе выпускаць 2.520 тон толі ў год.

* З 1 сьнежня па 1 студзеня абвешчан месячнік штурму лесазагатовак і лесавывазкі.

* 25 рабкораў фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» ўнесьлі 161 руб. на пабудову самалёту «Рабселькор — ударнік Віцебшчыны».

* З 1 па 14 студзеня адбудуцца зімовыя канікулы па школах. Канікулы вызначана скарыстаць для падрыхтоўкі школ да пераходу іх па новую вучэбную праграму.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Крызіс францускага ўраду

Фармаваньне габінэту даручана Шотану

ПАРЫЖ, 16. Агенцтва Гавас паведамляе, што фармаваньне новага габінэту даручана Шотану. Шотан дасьць прэзыдэнту канчатковы адказ 17 сьнежня. Шотан меў нараду з Кайо, Блюмам, Мальві, Бэранжэ па пытаньні аб даўгох. Эрыё адмовіўся браць удзел у габінэце Шотана, аднак, Шотан будзе весьці далей з ім перагаворы. Шотан заявіў, што ён у першую чаргу імкнецца знайсьці кампраміс паміж палатай дэпутатаў і пастановамі выпаўшага ў адстаўку ўраду. На нарадзе Шотана з палітычнымі дзеячамі абгаварвалася пытаньне, ці зможа будучы ўрад дабіцца ад палаты дэпутатаў дазволу прыступіць да ўрэгуляваньня пытаньня аб даўгох, калі Вашынгтон дасьць афіцыяльныя запэўненьні адносна скліканьня ў бліжэйшыя часы канфэрэнцыі аб даўгох. У станоўчым выпадку Шотан будзе настойліва прасіць Эрыё захаваць за сабою партфэль міністра замежных спраў.

Шотан адмовіўся фармаваць габінэт

ПАРЫЖ, 17. Агенцтва Гавас паведамляе: «Учора Шотан адмовіўся сфармаваць габінэт міністраў. Прэзыдэнт рэспублікі Лебрэн учора даручыў фармаваць габінэт міністраў Поль Банкуру, які абяцаў даць адказ сёньня раніцою.

**

Шотан заявіў журналістам: «Ня гледзячы на ўсе мае намаганьні ў сучасны момант аказалася немагчымым прымірыць два зусім процілеглыя адзін другому пункты погляду на пытаньне аб даўгох. Пры гэтых умовах я, жадаючы застацца салідарным з Эрыё, палічыў за лепшае адмовіцца ад складаньня ўраду».

Амэрыканскі сэнат абмяркоўвае рэпрэсыўныя меры супроць Францыі

ВАШЫНГТОН, 16. Афіцыяльна паведамляецца, што поўнасьцю ўнесен ангельскі плацёж на ваенных даўгох ПАЗШ у разьмеры 95 млн. даляраў і плацяжы Чэха-Славакіі, Італіі, Фінляндыі, Літвы і Латвіі. Ня ўнесьлі плацяжоў Францыя — 19 млн. даляраў, Бельгія, Польшча і Грэцыя. У колах амэрыканскага кангрэсу высоўваецца рад прапаноў адносна мер супроць Францыі. Прапануецца абмежаваць амэрыканскі турызм у Францыі, адмовіць у прадастаўленьні камэрцыйных крэдытаў, павялічыць тарыфы і г. д.

Першы Дзяржаўны Тэатр БДТІ

Сёньня — Кузьма Чорны

БАЦЬКАЎШЧЫНА

Эпопэя ў 4-х дзеях.

Пачатак у 8 гадзін вечара. Білеты ў раб. касе і касе тэатру.

10-ы ДЗЯРЖЗЬВЯРЫНЕЦ

ПРЫБЫЎ НОВЫ ТРАНСПАРТ

зьвёр і птушак.

Зьвярынец адкрыт з 9 гадз. раніцы да 11 гадз. вечара штодзенна.

Па калектыўных заяўках прадстаўляецца 50 проц. скідкі. Звяртацца ў кантору зьвярынцу загадзя.

ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА. Каса—ад 12 г. дня	Гукавы мастацкі фільм СУСТРЭЧНЫ
СПАРТАК. Каса—ад 1 г. дня	Гарольд Лейд у замежн. фільме МАЛОДШЫ СЫН. Камэдыя ў 8 частках
ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ. Каса—ад 12 г. дня.	Мастацкі фільм У горад уваходзіць нельга. Звыш прагр.—Кіно-хроніка.
Пралетары	Вячэрнія сэансы ПАТ і ПАТАШОН у камэдыі ПАЧАТАК КАР'ЕРЫ. Дзенныя дзіцячыя сэансы БОЙКІ ЖЫЦЬЦЯ

МЕНСКІ МАЛОЧНА-ПРАМЫСЛОВЫ ТРЭСТ

арганізуе ў г. Менску

3-месячныя КУРСЫ па падрыхтоўцы тэхнікаў-нармоўшчыкаў для работы ў сыстэме Менмалпрамтрэсту.

На курсы прымаюцца асобы ва ўзросьце ад 18 год, якія маюць асьвету ў аб'ёме 7-годкі. Могуць быць прыняты асобы з асьветай менш 7-годкі, але знаёмыя з нармаваньнем або рабочыя з значным вытворчым стажам і належнай падрыхтоўкай.

Курсанты забясьпечваюцца стыпэндыяй, інтэрнатам і сталоўкай.

Жадаючыя паступіць на курсы павінны падаць у сэктар кадраў Менмалпрамтрэсту (Савецкая, 70) заяву і наступныя дакумэнты: даведку аб адукацыі, даведку аб сац. паходжаньні і становішчы, даведку аб стане здароўя, засьведчаную анкету і характарыстыку аб апошняй рабоце.

Заявы з дакумэнтамі прымаюцца

да 25 сьнежня.

Сэктар кадраў Менмалпрамтрэсту.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР

19 сьнежня

толькі адзін аб'яднаны канцэрт

віяланчэліста Герц Цомік

І ўдзельніка сусьветнага конкурсу піяністаў імя Шопэна ў Варшаве ў 1932 г.

піяніста НАТАНА ПЕРАЛЬМАН

Падрабязнасьці ў афішах.

Білеты ў рабочай касе з 12 да 2 і з 4 да 6 гадз. і ў касе тэатру.

Наркамасьветы 20-га сьнежня 1932 г. у Менску

— склікаецца —

Усебеларуская нарада-канфэрэнцыя культпалітасьветных працаўнікоў:

райінспэктароў палітасьветы, загадчыкаў райдамоў культуры, сельскіх дамоў культуры і культ. працаўнікоў б-ці МТС.

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Рэалізацыя пастаноў ЦК КП(б)Б, СНК і калегіі НКА аб масавай культпалітасьветнай рабоце (дакл. т. Рудніцкі).
2. Мерапрыемствы па рэалізацыі пастаноў сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б аб агразоатэхпрапагандзе і падрыхтоўка да пасеўнай кампаніі (дакл. НКЗ).
3. Удзел культпалітасьвет. устаноў у мабілізацыі сродкаў (дакл. НКФ).
4. Аб ходзе ўсенавучу і лікбезу (дакл. т. Захарык).

Нарада адбудзецца ў 12 гадз. дня.

Прапануецца ўсім райАНА забясьпечыць яўку на нараду згодна дадзенай разьвёрсткі.

Наркамасьветы.

Менгараддзел працы Менгарстрахкаса і Дзяржбанк

папярэджваюць усіх страхавацеляў г. Менску і раёну

што без прадстаўленьня банку разьліковай ведамасьці аб зарплаце і колькасьці пэрсаналу і загаду аб пераводзе страхкасе належных страхузносаў,

Дзяржбанк ня прымае ад сваіх кліентаў чэкі

АБО ЧЭКІ-АСІГНОЎКІ НА ЗАРПЛАТУ.

Адначасова аддзел працы і страхкаса прапануюць усім тым страхавацелям, якія яшчэ не прадставілі разьліковыя ведамасьці або статталёны за лістапад і за мінулыя месяцы, прадставіць іх страхкасе

НЕ ПАЗЬНЕЙ 22 СЬНЕЖНЯ.

За невыкананьне гэтага вінаватыя будуць абкладзены штрафам у адміністрацыйным парадку да 100 руб.

Менгараддзел працы
Менгарстрахкаса
Дзяржбанк

З КАНЦА БЯГУЧАГА 1932 ГОДУ

Інстытут эканомікі Беларускай Акадэміі Навук

ПРЫСТУПАЕ ДА ВЫДАНЬНЯ БІБЛІЯТЭКІ ПАД НАЗВАЮ

„ЭКАНАМІЧНАЯ БІБЛІЯТЭКА"

пад рэдакцыяй прафэсара Т. Ф. ДОМБАЛЯ.

„ЭКАНАМІЧНАЯ БІБЛІЯТЭКА" будзе складацца з пяці наступных сэрый:

І-я сэрыя—Маркс, Энгельс, Ленін, Сталін;
ІІ-я сэрыя—„Эканамічная школа";
ІІІ-я сэрыя—працы Інстытуту эканомікі;
ІV-я сэрыя—навукова-папулярная
V-я сэрыя—Эканамічна-тэхніч. бібліятэка

Выданьне разьлічана на 3 гады і будзе заключаць у сабе каля 100 аркушаў у сотні дзесяці аркушовых выпускаў. Па выхадзе працы „Эканамічнай бібліятэкі" наступаюць у продаж ва ўсе магазыны Дзяржаўнага Выдавецтва Беларусі і БАКТ.

На ўсе сэрыі адкрыта абанэмэнтная падпіска. Звяртацца па адрасе: Менск, Беларуская Акадэмія Навук.

Даводзіцца да ведама ўсіх цэнтральных, рэённых прадпрыемстваў і ўстаноў, што надалей

ДЛЯ АТРЫМАНЬНЯ ЗАРПЛАТЫ

НЕАБХОДНА ў абавязковым парадку ПРАДСТАЎЛЯЦЬ:

1. Адначасова з касплянам—асобную даведку аб фондзе зарплаты, зацьверджаным вышэйшымі арганізацыямі—НКП або НК РСІ.
2. Не пазьней, чым за два дні да тэрміну выдачы зарплаты—плацежную ведамасьць.
3. На адвароце касавых пляну (або даведак аб фондзе зарплаты) рабіць даведачны надпіс аб тэрмінах выплаты зарплаты, устаноўленых калдагаворамі.
4. Пры прадстаўленьні пляну на кожны наступны месяц прадстаўляць таксама весткі (або плацежную ведамасьць) аб фактычных выдатках па фондах зарплаты, уключаючы як выплаты наяўнымі, так і ўсе ўтрыманьні.

Касплян на 1-шы квартал і студзень 1933 г. неабходна прадставіць не пазьней 20 сьнежня 1932 г.

Тым прадпрыемствам і ўстановам, якія не прадставілі ў тэрмін касавага пляну і ня выканалі аднаго з пералічаных вышэй умоў,

БУДЗЕ СПЫНЕНА ВЫДАЧА СРОДКАЎ.

Усебелкантора Дзяржбанку.

Беларускаму трэсту АБШ

ПАТРАБУЮЦЦА:

вопытныя

машыністка-сакратар

і рахункавод-картацэтчык.

Звяртацца: Пляц Волі, 4. АБШ.

У аддзел аб'яў званеце па тэлефону 7-81

МЕНГАРКОМ КП(б)Б і МЕНГАРСАВЕТ

18 сьнежня у 10 гадз. раніцы, у клюбе Менгарсавету (пляц Волі № 4)

СКЛІКАЮЦЬ канфэрэнцыю жанчын калгасьніц і работніц саўгасаў.

ПАРАДАК ДНЯ:

1) Аб разьмеркаваньні даходаў калгасаў і арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.
2) Аб ходзе выкананьня ўсіх відаў загатовак.

Сакратары сельпартячэек і старшыні с-саветаў Менрвёну павінны забясьпечыць своечасовую яўку выбраных дэлегатак на канфэрэнцыю.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б
МЕНГАРСАВЕТ.

СЭСІЯ

БЕЛАРУСКАЙ АКАДЭМІІ НАВУК

прысьвечаная

ПАДНЯЦЬЦЮ ЎРАДЖАЙНАСЬЦІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

— АДБУДЗЕЦЦА —

у 7 гад. веч. у Доме Камасьветы ў г. Менску 20-XII 1932 г. імя К. Маркса (рог вул. Карла Маркса і Энгельса).

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Задача навукі ў барацьбе за падняцьце ўраджайнасьці сельскай гаспадаркі—дакл. Першы Віцэ-Прэзыдэнт т. Домбаль.
2. а) Праблема хэмізацыі сельскай гаспадаркі БССР—дакл. акад. Кедраў-Зіхман і вуч. спэц. Пратасеня.
   б) Роля хэміі ў барацьбе з хваробамі с-гаспад. культур—дакл. вуч. спэц. Дарожкін.
3. Прыродна-кліматычныя ўмовы БССР і праблема ўзьняцьця ўраджайнасьці:
   а) кліматычныя магчымасьці БССР у справе падняцьця ўраджайнасьці—дакл. праф. Кайгародаў.
   б) Натуральны і культурны рэльеф палёў БССР, як фактар узьняцьця ўраджайнасьці дакл. акад. Афанасьеў.
   в) Мэтады асваеньня балот БССР і магчымыя вынікі гэтага асваеньня ў другой пяцігодцы—дакл. вуч. спэц. Усесаюзн. балотн. інстытуту Дакунін.
4. а) Праблема новых культур у БССР—дакл. вуч. спэц. т. Ганчарык.
   б) Новыя культуры на асушаных балотах БССР—дакл. вуч. спэц. Усесаюзнага балотнага інстытуту Шыперна.
5. Вытворчы плян навукова-дасьледчай працы АН БССР на 1933 г.—дакл. Прэзыдэнт АН акад. Горын.
6. Праект статуту АН БССР—дакл. неадменны сакратар акадэмік Пяткевіч.

Прэзыдыум АН БССР.

Менск, друкарня «Зьвязда». Галоўлітбел № 336.